**У ЦІХАЙ ЛАГУНЕ**

www.kamunikat.org

www.kamunikat.org

**ДЗМІТРЫЙ ШАТЫЛОВІЧ**

# У ЦІХАЙ ЛАГУНЕ

www.kamunikat.org

**Wydawnictwo PRYMAT**
**Białystok 2010**


www.kanunikat.org

# ЖЫЦЦЁВЫЯ СЦЕЖКІ

## ЖЫЦЦЁ, ЯК ЛОДКА Ў АКІЯНЕ

Жыццё, як лодка ў акіяне,
Плыве ў бязмежныя прасторы,
Не ведае канца змагання,
Што ў свеце дзесь існуюць горы.
А ў акіяне часта хвалі
Гайдаюць, заліваюць пенай,
І бліскавіцы з цёмнай далі
Расходзяцца, як кроў па венах.
У пустаце махаюць вёслы,
І ўжо здаецца: лодка тоне,
Ды набірае сіл узнёслых
І ў даль плыве на хваль кароне.
Як бура сціхне, згіне вецер
І сонца выгляне з-за хмары,
То хвалі ёй вясёлкай свецяць,
Магічныя кідаюць чары.
Плыве тады яна спакойна,
Шукае дзесь другую лодку,
Як знойдзе, прывітае стройна,
Каб час правесці з ёй салодка.
І забываюць разам гора,
І перажыты час бяздзейны,
Выходзяць з акіяна ў мора,
Каб гавані шукаць прыемнай.
І разам знойдуць дзесь лагуну
Каб там астацца назаўсёды,
І, не чакаючы фартуны,
Прыпамінаць свае прыгоды.

**ЗАБАВЫ**

Ужо ад дзяцінства ўсе любяць забавы,
Бо ўжо ад калыскі вучылі нас ім,
Калі пераможам чакаем на бравы,
І цешымся потым з заслужанай славы,
Пасля пахвалы аб нас чуем уздым.
У школе ўсім гульням нас вучаць усюды,
Аб іх прачытаем у кніжках сваіх,
Паверым з іх часта ў фантазіі, ў цуды,
У дзіўныя лекі ад рознай прастуды,
І бавімся ў лекараў добрых і злых.
Нас вучаць там бавіцца ў розныя войны,
Як ворага знішчыць, шпіёна знайсці,
Што маюць танкісты снарад бранябойны,
Які прабівае другі танк спакоўна,
Бо трэба спаліць танк, наперад пайсці.
Калі падрасцём, то прымаем сур’ёзна
Навукі, якія забавы далі.
Суддзёю ў судах забаўляемся грозна,
Стараемя від паказаць грацыёзны,
Зусім не такі, як у гульнях калісь.
Сур’ёзна ўсе бавімся перад экранам,
Калі мы паказваем від важака,
Не хочам сябе прадстаўляць, як тырана,
А толькі разумнага ў працы тытана
Які памагчы можа ўсім беднякам.
У гульнях ваенных мы мелі кінджалы,
Цяпер мала вартыя ў гуках гармат.
Хоць гінуць у бітвах не раз генералы,
Аднак у вайне памірае іх мала,
Таму яны любяць ваенны набат.

**ЗМЯРКАННЕ**

Змярканне да нас падыходзіла ціха
Праз шэрае поле з высокай пшаніцай,
Праз рэчку, праз луг, дзе плюскоча крыніца,
Дзе жаб у траве ўжо шукае бусліха.
Прайшло гай, пагладзіла хваляй лістоту,
Дайшло да адзінай цямнеючай грушы,
Паіла расой іх пасля дзённай сушы,
Пачулі яны ад яго чар пяшчоты.
Да нас падышло ўжо ў маркотнай вуалі,
Як стомлены жук, нам упала пад ногі,
І зноў паднялося, пачуўшы трывогу,
На захад пабегла па полі, як хвалі.
На небе над намі заззялі ўжо зоркі,
Цвікі залатыя на купале цёмным,
Чакалі з усходу на месяц нястомны.
Мільгалі бурштынавым бляскам пацёркі.
І цемра паволі ідзе за змярканнем,
Дагнаць мы хацелі б яго і не можам,
Ідзём шэрай сцежкай за ім паміж збожжам,
Чакаем аж месяц прышле прывітанне.
Змярканне на захад адходзіць далёка,
Прамень яго з кожнай хвілінай знікае,
І цемра ўсіх нас у палон захапляе,
Надзеі чакаем на небе высока.
І хутка з-за хмары са светлай усмешкай
З'явіўся з усходу нам месяц прыгожы,
І ўцешыўся ў цемры ўміг кожны прахожы,
Бо нам асвятліў ён дарогі і сцежкі.

**ЗІМА**

Даўно ўжо не было зімы,
І прыплыла яна раптоўна
З марозам ціхім і нямым,
З начною цемрай, як на чоўнах.
Мароз без літасці жыццё
Забраў у гарадах бяздомным,
У тых, што страцілі чуццё,
Як іх схапіў дзесь непрытомных.
І электрычнае святло
Ён выключыў у многіх сёлах.
Дарогі снегам замяло,
Буксуюць у машынах колы.
І на шашы грузавікі
Замерлі, быццам ад прастуды.
Не могуць ехаць цягнікі,
Бо рэйкі трэскаюць усюды.
Я бачу з дому – за вакном
Стаяць навокал гурбы снегу,
Бялее ён, як палатно,
Ляжыць пасцель, як для начлегу.
Людзей зноў бачу, як ідуць
Да працы, снег ім па калена.
З усходу ветры ў твар ім дзьмуць,
А вочы лепіць снег, як пена.
Шкада мне іх, бо помню час,
Як я калісь хадзіў да працы,
Як боль пачуў, бо ішыяс
Мяне схапіў на снежным пляцы.

**ДАРОГІ**

У жыцці я прайшоў ужо многа дарог,
Па дарогах калдобістых ехаў не мала,
І такіх, дзе знянацку спаткаць смерць я мог,
На якіх на мяне рыхтавалася джала.
    Удалося праехаць мне побач яе,
    На дарогу бяспечную выехаць хутка,
    У аброжак не трапіць, на нож, на кап'е,
    І шукаць дзесь далей дзён вяселля і смутку.
І цяпер невядомая сцежка мая:
Ці чакае мяне на ёй радасць, пакута,
Ці выбоістай будзе мая каляя,
Ці скаштую там слодыч, ці толькі атруту.
    Я хацеў бы сустрэць на ёй добрых сяброў,
    Каб яны памаглі мне ў часы небяспекі,
    Каб не страшылі ўжо на ёй раны і кроў,
    Каб мяне не пужалі навокал калекі.
А падтрымкі палітыкаў мець не хачу,
Спадзяваюся толькі ісці ўласнай сілай,
Запалю сам у цемры лампаду, свячу,
Пралячу праз яе, быццам птушка на крылах.
    На дарозе сваёй сотні мэтаў я меў,
    Да адной дабягаў і шукаў зноў другую,
    Не адзін раз я чуў і нянавісць, і гнеў,
    Як да мэты дзесь бег цёмнай ноччу ўсляпую.
Не хацеў я ісці да чужога святла,
Каб не думаў сусед, што хачу нешта ўкрасці.
На дарозе калісь я ўсё страціў датла.
Ды пасля да мяне прытулілася шчасце.

**„БАЛОТА”**

Калісьці за пунямі збоку сяла
Блішчала вада аж да самага леса,
Пакуль не прыкрыла яе ўдзень імгла
Сваім валахатым і шэрым кампрэсам.
Як люстра блішчала яна ў летні дзень,
Калі сонца ззяла і слала спякоту,
Калі жалі жыта, авёс ці ячмень.
У вёсцы назвалі луг гэты „Балотам”.
Я помню, як лодкаю плаваў па ім,
І як апускаў я ў ваду мае вёслы,
Шукаў я на ім з пекных кветак кілім,
Як плыў да яго, чуў сябе, як дарослы.
Я часта там бачыў знаёмых маіх,
Якія ў ваду невад з лодкі кідалі,
Цягнулі яго і смяяліся ўслых,
Ля берага рыбу з яго выбіралі.
Былі пераважна ўюны, карасі,
А часам скакалі акунь з шчупакамі,
Іх часта я ў торбе дахаты насіў,
Адзін раз прынёс матцы сома з вусамі.
Вада замярзала на лузе зімой,
І коўзацца можна было па тым лёдзе,
І з вёскі прыходзілі дзеці гурмой,
Шумелі ўвесь дзень там пры добрай пагодзе.
Ды ўлады прыйшлі, асушылі ўвесь луг,
Вада паплыла з рыбай рэчкай да мора.
Трава тут расце, зелянее наўкруг
І косяць яе для кароў у аборах.

**СІВЫ КАСТРЫЧНІК**

Кастрычнік прыйшоў – пасівела асіна,
Пакрылася срэбнай наўкол сівізной,
Лысеюць галіны яе з верхавінай,
Здаецца, змянілася ўся ў сухастой.
Таксама ўжо страцілі вербы лістоту,
І скардзяцца ціха на долю сваю,
Іх ўсіх агартае паволі дрымота,
Здаецца, ў адну ўсе папалі сям'ю.
Пужаюць здалёк сівізною туманы,
Сівеюць лугі ад пушыстай імглы,
А шэрыя хмары плывуць, як дываны,
Паказваюць нам залатыя іклы.
У вёсцы зусім аблыселі таполі.
І дахі дамоў пасівелі ў імгле,
Здаецца, што сонца не ўбачаць ніколі,
Што будзе заўсёды так шэра ў сяле.
Імглою пакрытыя ўсюды дарогі,
І лысымі бачу навокал сады,
Там скінулі дрэвы сабе ўніз пад ногі
З галін ўсе вісеўшыя доўга плады.
Не страцілі толькі ядлоўцы іголак,
Стаіць кожны стройна зялёны, густы,
Яшчэ не згубілі чароўных пацёрак,
Абвітыя імі ядлоўцаў кусты.
Далей зелянеюць далёка ад вёскі
Іголкавыя ў мгле густыя лясы,
Аднак не даходзяць адтуль пагалоскі,
Замоўклі птушыныя ўжо галасы.

**КАЛІ АДЫХОДЗЯЦЬ СЯБРЫ**

Калі адыходзяць сябры,
Шугаюць у нашай душы,
Як цёмнаю ноччу кастры,
Старых успамінаў каўшы.
Пражытыя ўбачым гады,
Дзе разам мы з імі ішлі,
Як кожны з нас быў маладым,
Мінаючыасткі зямлі.
Успомнім дарогі свае,
І ўсе перашкоды на іх,
Як нам дзесь бліснула калье,
І кожны наш радасны ўздых.
Шкадуем, што ўжо іх няма,
Што нам не памогуць яны,
Як плюне ў твар снегам зіма,
Бо будзем без іх там адны.
Губляемся ў хвалях жыцця,
Успомніўшы пройдзены шлях,
Чакаем хвілін забыцця,
Каб даўні не мучыў нас жах.
І будзем у сэрцы чуць боль,
Што іх не сустрэнем нідзе,
Што больш наша хата і столь
Не можа на іх паглядзець.
І толькі дзесь часам у сне
Мы з імі пабачымся зноў,
Забыўшы аб соннай мане,
Там скажам ім некалькі слоў.

**МАСТЫ**

Прайшоў я ў жыцці сваім безліч мастоў
Над хвалямі ў рэках, над прорвай пячоры,
З вяровак, з бетону, з малых ланцугоў,
Вісячых, дрыжачых, гаручых, як порах.
Як поўз па адным, ён дрыжэў, як струна,
Ад выбухаў блізкіх варожых снарадаў,
Здавалася, ўнізе стаяў сатана,
Чакаў, калі ў рукі яго буду падаць.
Калі раз праходзіў па кладцы адной
Над рэчкай халоднай начною парою,
Пужаў брэх сабакі за дома сцяной,
Дрыжэў, што ён кліча пагоню за мною.
Як я па вяровачным мосце ішоў
Над вельмі шырокаю бруднай ракою,
Гайдаў вецер мною, як лёгкім каўшом,
Трымаўся вяровак я моцна рукою.
Пантонны мост бачу выразна ў час сну,
Таксама як бег я па ім цёмнай ноччу,
Каб выйсці на бераг, знайсці там сцяну,
Каб бляскам не ззялі ракеты мне ў вочы.
Мне сняцца яшчэ разводныя масты:
Плывуць караблі белай ноччу Нявою,
Анёл над саборам блішчыць, як святы,
Трымаючы крыж залаты над сабою.
На мосце мяне цалаваў грыбасей,
І страшылі кулі, як бег у атаку.
Па розных мастах, як калісь Адысей,
Дайшоў я нарэшце ў свой дом, у Ітаку.

**КОЛЕРЫ ЗМЯРКАННЯ**

Выходзьце з дамоў і пячораў
Са схованак дзённых службовых
Глядзіце ў змярканне на мора,
На колеры хваль лазурковых.
    Глядзіце на колеры сонца,
    На дыск над зямлёю чырвоны,
    Здаецца, што там зямлі донца
    І ззяе з яго ў мгле карона.
Глядзіце на люстра азёраў,
Пакрытае радужным шоўкам,
Не чуць на іх гукаў матораў,
Якія ўцяклі на начоўку.
    Глядзіце на горы і ўзгоркі,.
    Пакрытыя светлаю сеткай,
    На небе бліснулі ўжо зоркі.
    Мігцяць на плафоне, як кветкі.
Глядзіце на лес, на даліны,
Як колер змяняюць паволі,
Здаецца, павук павуціннай
Забраць хоча ўсіх да няволі.
    Глядзіце, як дыск пры пагодзе
    Хаваецца ў прорву глыбока,
    Пад цёмнаю хмарай на сподзе,
    Заплюшчвае светлае вока.
Калі пацямнелі бульвары,
Дамы і плады ў агародзе,
У цемры на небе з-за хмары
Заззяў ясны месяц на ўсходзе.

**СТАРОЕ ПАКАЛЕННЕ**

Старое наша пакаленне
У Лету кане кожны год,
Іх успаміны, летуценні
Забудзе хутка ўвесь народ.
Не будзе ён цікавы дзеяў,
Якія мы перажылі,
Няволю, нашы юбілеі,
Што мы рабілі, дзе былі.
Як мучылі нас у ГУЛАГ агах,
Як мы кацлагеры прайшлі,
Як з крыкам пад чырвоным сцягам,
На танкі беглі мы калісь.
Як тых, што згінулі ў атацы,
Без музыкі, без паніхід,
Кідалі ў дол на полі, пляцы,
Дзе быў забіты, быццам гнід.
Лічылі нас гарматным мясам
Праз доўгі час Масква, Берлін,
Ганялі нас па розных трасах,
Ад куль памёр там не адзін.
Мільёны згінулі ў няволі
Ад голаду і бізуноў,
Ніхто не ўспомніць іх ніколі,
Як не аставілі сыноў.
Даўно няма нідзе жывога
Тут завадатара вайны.
Гісторыя аб ім напіша многа,
Каб не забыць яго віны.

**БАЦЬКОЎСКІ ДОМ**

Я прыпомніў, як бацька наш дом будаваў,
Як ён грошы плаціў за чужы агарод,
Як пасля ён фундамент пад дом закладаў,
І як рос дом паволі амаль цэлы год.
А калі мы прыехалі жыць у яго,
Ганарыўся, што меў ён кафляную печ,
Што азбеставы дах не захопіць агонь,
І што громаадвод там тырчаў, быццам меч.
Што была ў доме кухня, камора з акном,
Быў пакой для вучобы і спальны пакой,
Што заглядвалі з вуліцы кветкі ў наш дом,
Як цвілі разам з вішнямі цёплай вясной.
Што яго пільнавалі вароты з замком,
І прыгожыя веснічкі побач варот.
Я ўжо ў школу хадзіў басанож і пяшком,
Хоць у доме ляжаў не адзін добры бот.
Я пражыў у тым доме юнацтва сваё,
Дачакаўся я ў ім громаў дзікай вайны,
І забралі мяне да варожых краёў,
Каб на некалькі год мне надзець кайданы.
Ацалеў дом у сківіцы цяжкіх баёў,
Як суседзяў яго пажыраў ураган,
І прыняў ён мяне, як вярнуўся я зноў
У парогі яго, як вайны ветэран.
Хоць цяпер прыгажэйшым намнога стаў ён,
Бо на сонцы бляшаны блішчыць на ім дах,
Ён самотны стаіць у зімовы сезон,
І мажліва, што бачыць мяне ў сваіх снах.

**ПЕРШАЯ ПРАГУЛКА ВЯСНОЙ**

Адляцела зіма дзесь раптоўна,
Бо пачула ўжо крокі вясны.
Сонца промні ўжо ззяюць чароўна,
Разрываюць зімы кайданы.
Распусціла ўвесь снег за верандай,
Паплылі па зямлі ручаўкі,
На акне фіялетам лаванда
Усміхнулася, як васількі.
За акном я пабачыў пралескі,
Аб вясне ўжо давалі мне знак,
Як адкрыў я акно, занавескі
Заварушыў раптоўна скразняк.
Занавеска дрыжэла ад ветру,
Паднялася пасля ціха ўверх,
Я пачуў свежы подых паветра,
То прыйшоў ад вясны цёплы смех.
Я адзеўся, пайшоў на прагулку,
Па вядомых слядах да ракі,
Я вясну чуў у кожным завулку,
Чулі нават яе хмызнякі.
Выйшаў з горада я на раўніну
І пабачыў, што ўсюды трава
З глыбіні выпускала быліны.
Зелянела наўкол мурава.
Як быў дома, то чуўся няпэўны,
Ці тоява, ці толькі мана,
Па прагулцы я ведаў напэўна,
Што зіму ўжо прагнала вясна.

**САКРЭТНЫ СУПРАЦОЎНІК**

Сустракаюся з ім часам сам адзін
Дзесь на вуліцы ці на прагулцы ў парку,
Пастаю з ім разам некалькі хвілін
І расходзімся спакойна і без сваркі.
Я яго на месцы працы сустракаў,
Бо калісь звязала праца нашы лёсы,
Я калі яму на нешта наракаў,
На мяне да ўлад маіх ён слаў даносы.
І не толькі на мяне, і на другіх,
Быў сакрэтным супрацоўнікам партыйным,
Чутка хутка аб яго даносах злых,
Да мяне дайшла зусім неафіцыйна.
Папку тоўстую з даносамі яго,
Паказаў мне мой знаёмы патаемна,
Каб глядзець на вастрыё яго рагоў,
Бо яны пацІху колюць непрыемна.
І таму ён шкоды мне не нарабіў,
Бо пры ім я асцярожным быў заўсёды,
Прадчуваў падчас ігры яго гамбіт,
Каб у пастку пацягнуць, яго падходы.
А цяпер ён добры бацька, добры муж,
Ён таксама, як і я, быў інжынерам,
А што ён другі цягнуў калісьці гуж,
Можна з цяжкасцю знайсці дзесь у паперах.
Ён нікога не паслаў тады ў турму,
Нехта меці мог непрыемнасці ў час працы.
Злога слова не магу сказаць яму,
Бо пацІху працаваў ён, без авацый.

**ЦЫГАНСКІ ТАБАР**

Патрапіў зноў я ў родныя пенаты,
Дзе я калісьці бегаў басанож,
Вось луг вялікі блізка нашай хаты,
Дзе летам коні пасвілі мы ў спёку, дождж.
Сюды прыехаў раз цыганскі табар,
І можа з дзесяць распраглі вазоў,
Для нас дзяцей былі яны прывабай.
Мы акружылі іх з усіх бакоў.
Тады гарэлі там кастры навокал,
Яны варылі страву для сябе,
За дровамі хадзілі ў лес далёка,
Нясла цыганка хворост на гарбе.
Цыганкі ў доўгіх аж да пят сукенках
Хадзілі ў вёску многім варажыць.
Кавадла меў стары цыган маленькі,
На ім кляпаў патэльні і нажы.
А вечарам пры вогнішчы цыганкі
Спявалі, танцавалі доўгі час,
Цыгане гралі, стукалі ў бляшанкі,
Звінелі ў вёсцы скрыпкі, кантрабас.
Пасля ад’ехалі ў другую вёску,
Па іх астаўся светлы успамін,
Аб іх загінулі ў вайну ўсе пагалоскі,
Вайна схавала іх у каранцін.
Пасля вайны далі ім дзесь кватэры,
Зусім забаранілі качаваць.
Аб табарах цыганскіх на паперы
І ў песнях будуць толькі ўспамінаць.

**САКАВІК ПАСЛЯ СНЕЖНАЙ ЗІМЫ**

Пасля халоднай снежнай злой зімы,
Якая наваліла гурбы снегу,
Раптоўна выйшаў сакавік з турмы,
Прагнаў зіму праз ноч з яе начлегу.
Змяніў ён ранкам снег у ручаі,
Пацёкшыя да рэчак і ў азёры,
Лёд ён разбіў у рэчках у баі,
Яго пагнаў ён з грукатам у мора.
Ён паказаў нам дахі на хлявах,
Якія паламаў снег без спагады,
Прыгрэў зямлю, зялёная трава
Прыйшла на луг, пад хаты ў палісады.
І цешацца навокал вераб'і,
Абсеўшы гуртам выбраныя дрэвы,
Яшчэ не прыляцелі салаўі,
І не гучаць цудоўныя іх спевы.
Прыемна стала для звяроў лясных,
Віхры не сыплюць снегам ім у вочы.
І хутка будзе першы дзень вясны,
Час дня зраўняецца ў нас з часам ночы.
Святочны прыйдзе беларусам дзень.
Назвалі мы яго даўно «Днём волі»,
Напамінае ён нам дзеяў цень,
Як вырвацца хацелі мы з няволі.
І гуртаваць ён будзе нас далей
Да барацьбы за вольную дзяржаву,
За мову родную, за вольнасць для людзей
Без дыктатуры, без распраў крывавых.

**НЯДЗЕЛЯ**

Ад юнацтва любіў я нядзелі,
Бо схаваўшы пад плед галаву,
Доўга спаць мог на цёплай пасцелі,
Потым з маткай спяшыць у царкву.
Там любіў бляскі свечак наўкола,
На лампады глядзець ля ікон,
Слухаць спеў і не думаць пра школу,
Захапляцца, як зверху біў звон.
І любіў я нядзелю ў няволі,
Меў амаль цэлы дзень вольны час,
Меў сяброў, што жылі ў наваколлі,
І тады сустракаў іх падчас.
У нядзелю сустрэць мог сяброўку,
І правесці ўвесь дзень разам з ёй,
Пісьмы ўдзень напісаць і паштоўкі,
Пагуляць дзесь па снезе зімой.
Ды паўгода мне вольнай нядзелі
Не далі, як акопы капаў,
Вочы сквапныя фрыцаў глядзелі,
Цэлы дзень на мяне, як удаў.
Не было і на фронце нядзелі
Гналі ў бой нас, калі быў загад,
А варожыя кулі свісцелі,
Выбухалі снарады гармат.
А цяпер кожны дзень, як нядзеля,
Бо да працы не гоняць мяне.
Перажыў залатое вяселле,
І прабегла жыццё, як у сне.

**ЧАРОЎНЫ САД**

Калісь быў дом мой у чароўным садзе,
Акружаны быў пальмамі наўкол,
Стаялі, як салдаты на парадзе,
Іх кожны ліст блішчэў, як арэол.
　　У ім раслі прыгожыя папаі,
　　Якія заглядалі мне ў акно,
　　Плады салодкія, як каравai,
　　Звісалі, быццам грушы за сцяной.
Фантан вясёлкай пырскаў там высока,
Спяваў мне, не шкадуючы вады,
Пры ім алівы куст мне цешыў вока,
Паказваючы цёмныя плады.
　　Аліва там была, як каралева,
　　Плады яе манілі ўдзень мяне,
　　З густой лістотай мангавае дрэва,
　　Маргала да папаі пры сцяне.
Смакоўніца мне фігамі махала,
А фіга мае назву ў нас інжыр,
А дрэва тут названае сандалам,
Паветраны мне слала эліксір.
　　І многа руж расло наўкол фантана,
　　І водарны яны дарылі пах,
　　У дом прыходзіла ад іх духмянасць,
　　І пахлі імі сцены нават дах.
Мяне будзілі ранкам птушкі спевам,
Каб выйсці, паглядзець на цэлы сад,
Каб скаштаваць плады з якогась дрэва,
Паспрабаваць чырвоны вінаград.

**АДУВАНЧЫКІ**

Уздоўж вузкіх дарожак між купін
На зялёных высокіх сцяблінках
Залаціцца вясной, быццам лубін,
        Адуванчыкаў рой на галінках.
        Залацістыя кветкі пад восень
        На жаўцеючых моцных былінках
Замяняюцца ў пух, як вапоссе.
А пад ім бачым семя расліны,
Каб яго моцны вецер разносіў
        Па далёкіх прасторах краіны.
        І лятаюць усюды ў паветры,
        Часам дні, часам толькі хвіліны,
Адуванчыкаў крылы на ветры.
І, як знойдзе дзесь глебу насенне,
То без шуму яно, без аркестра,
        У яе запускае карэнне.
        Так і з вёсак у нас на Падляшшы
        Адышло не адно пакаленне.
Вецер свежы збіраў з вёсак нашых,
Усю лепшую моладзь у школы,
Ці вайсковыя даў ім камашы,
        І раскінуў па свеце наўкола.
        Па чужых гарадах і мясцінах
        Разляцеліся ўсе, быццам пчолы.
А цяпер часта ў ЗША, ў Аргенціне
Сустракаем людзей з нашых вёсак,
Па гарах дзесь чужых і далінах
        Іх машын прабягаюць калёсы.

## „ЖАМЧУЖЫНА ЗАХАДУ”

Успамінаю шэрую плаціну,
Гідраэлектрастанцыю пры ёй,
Ля генератараў прыгожую дзяўчыну,
Якая час праводзіла са мной.
    Шумела рэчка Бобр пад той плацінай,
    А „Захаду жамчужына” ўгары,
    Нас запрашала да сябе ў гасціну,
    Дзе цалаваліся мы ўвечары.
У той „Жамчужыне” ў малым пакоі
Мы пры балконе з відам на раку,
Зганялі час у радасным настроі,
Пілі кагор, абнятыя ў кутку.
    Заходзіў я і да яе кватэры,
    Жыла яна ў Сядленціне адна.
    Малы пакой, ад калідора дзверы,
    З адным акном і цёмны, як турма.
У вольны час мяне вадзіла ў горы,
Блукалі мы паміж высокіх скал,
Заходзілі мы ў цёмныя пячоры,
Там адпачынку быў для нас прычал.
    З ёй абышоў я ўсю Яленю-Гуру,
    Ледзь не звіхнула там яна нагу.
    Ёй паказаў царквы архітэктуру,
    Як літургію меў святар Бягун.
Ды лёс пасля нас раздзяліў надоўга,
Яшчэ мы раз спаткаліся калісь,
І разышліся нашыя дарогі,
Цяпер мае ўспаміны ажылі.

**МЕЛОДЫІ ДЗЯЦІНСТВА**

Мелодыі з майго дзцінства
Нясуцца рэхам праз жыццё,
Пры цёплых ласках мацярынства,
Як чуе кожнае дзіцё.
Спеў маткі над маёй калыскай
На роднай мове ўсіх дзядоў
З маёй душою зліўся блізка,
Жыве да сённяшніх гадоў.
І песні ўсіх дзяўчын вясковых,
Якія чуў я пры акне,
Ляцелі рэхам праз дубровы,
Цяпер мне сняцца часта ў сне.
Мелодыю тых песень чую,
Я не забыў яшчэ іх слоў,
Іх, як малітву дзесь святую,
Я паўтараю ўсюды зноў.
Шум нават ветру на загонах
Звініць мелодыяй басоў,
А карканне жывой вароны
Чую ў сімфоніі лясоў.
Мелодыі вясенніх птушак,
Як рэха чую ў цішыні,
Яны ўвайшлі глыбока ў вушы,
Звіняць аркестры ў вышыні.
Яны гучаць і ўдзень, і ноччу,
Калі сяджу дзесь сам адзін,
Калі заплюшчу нават вочы,
Прыходзіць радасны ўспамін.

## УСХОДНЯЯ СЦЯНА ЕЎРОПЫ

Пустыя вёскі на памежжы,
Лясамі зараслі палі,
Няма ў лясах слядоў мядзведжых,
Мядзведзі нават уцяклі.
Стаяць старыя ў вёсках хаты,
Рэлікты ўжо забытых дзён,
Аброслыя імхом стракатым
І без дзвярэй, і без акон.
Хоць ветры страшаць тут, як чэрці,
Сустрэнем тут старых сялян.
Яны чакаюць, каб памерці
У вёсках, дзе расце бур'ян.
Адсюль даўно ўцякла ўся моладзь,
Дзесь на чужыну ў гарады,
Дзяцей няма ў вясковых школах,
Сялян не бачна маладых.
Яны аставілі ў руіне
Сваіх бацькоў, сваіх дзядоў,
Каб батракамі на чужыне
За грошы мучыцца ў паноў.
Калі іх выкінуць там з працы,
То спяць у норах, як краты,
Глядзяць на панскія палацы,
А голад мучыць жываты.
Аднак вярнуцца ўжо не хочуць
Да родных хат, бацькоў, бяроз,
Вядуць далей там лёс сірочы,
Хоць у вачах іх поўна слёз.

**ЖАЛЕЙКА**

Авечкі загнаўшы ў маленькі катух,
Пайшоў, дзе густая расла самасейка,
Прысеў у яе адзінокі пастух,
З-за пазухі выняўшы хутка жалейку.
    Цудоўная песня пабегла наўкол,
    Якую ўсе слухалі з зачараваннем,
    Здавалася ім, што спяваў дзесь анёл
    Пра смуткі разлукі, пра слодыч кахання.
Хоць песня яго ўся гучала без слоў,
Ды ўсе разумелі чароўныя гукі,
Іх сэнс адчувалі, як позірк сяброў,
Бо чулі ў мелодыі радасць і мукі.
    На сад і на луг, на прастору палёў
    З мелодыяй песні ўжо сцелецца вечар,
    Расходзіцца ўсюды жалейкі напеў,
    Дайшоў і да лесу, да самай гушчэчы.
Заціхлі ўсе птушкі, замоўк салавей,
У садзе шумець перастаў хутка вецер,
Які гучна бегаў між дрэў і алей,
Каб слухаць напеў, як дзівак на банкеце.
    На лузе ўжо стала цямнець асака,
    Схавалася ў чорную цень чарамшына,
    Ды толькі жалейка ў умелых руках
    Не моўкла, спявала ўвесь час безупынна.
Іграе пастух сотні песень без нот,
Да поўначы будзе іграць на жалейцы.
І скаргі яго адчувае асот,
Які тут расце бліз яго ў самасейцы.

**НАЧНАЯ ВЯСЁЛКА**

Зайшоў я ў поле, каб забыць спякоту,
Калі дыск сонца скрыўся за гарою,
А хмара з лесу выйшла праз вароты,
Закрыла неба шэраю імглою.
    І ў гэтай цёмры хутка перапёлкі
    Закончылі ўжо такаваць у жыце.
    На поўдні загарэлася вясёлка,
    Мост колераў я ўбачыў на арбіце.
У чэрні ночы, як у хвалях мора,
Блішчэлі зоркі ў радугі праменнях,
І ззялі ў бляску іх, як метэоры,
Ці, як брыльянты ў тысячных адценнях.
    Апалаў стужкі, дарагіх рубінаў,
    Між лазурытаў ззялі і агатаў,
    Між жэмчугаў і залатых бурштынаў,
    З нюансамі чароўнымі гранатаў.
Чароўны мост праходзіў аж за рэчку,
Два берагі злучаў сваёй дугою,
Адзін канец выходзіў з поля грэчкі,
Другі запаў у сосны за ракою.
    А ў рэчцы ззяў другі мост, як у люстры,
    І разам асвятлілі ў небе хмары,
    Яны ішлі, як дзесь салдаты ў муштры,
    Аж загучалі маланак фанфары.
І стрэлы з маланак і мост вясёлкі
Цудоўна ззялі у прадонні ночы.
Было так ясна, што знайсці іголку
Я лёгка мог бы там, адкрыўшы вочы.

**СМУТАК**

Ішоў адзін ля шэрых хваляў мора,
Лілася з неба ў промнях духата,
А твар яго выказваў смутак, гора,
Чуў, што ў душы пануе пустата.
Не чуў тады кахання, ні жаданняў,
Як прэс сціскала галаву нуда,
Стагнала сэрца ад пакут змаганняў,
Што ўдзень прынесла цяжкая бяда.
Ён з горада прыйшоў сюды бязмоўна,
Пачуўшы ад знаёмага дзячка,
Што ў катастрофе згінулі раптоўна
Яго сын з жонкаю, яго дачка.
Чакаў ён іх, наняў ім ён кватэру,
На адпачынак ехалі сюды,
Прыгатаваў учора ім вячэру,
Не дачакаўся госцяў маладых.
Атрымаў ён тут вестку нечакана
Аб страшнай смерці ўсіх сваіх дзяцей,
І ходзіць ён па беразе, як п’яны,
Не знае, што з ім будзе надалей.
Ён адзінокім чуецца ў пустыні,
Дрыжыць ад холаду ён, як зімой,
Стаіць, здаецца, ён адзін па льдзіне
І бачыць снег над кожнаю труной.
Такога смутку ён не знаў ніколі,
Яго ніякі не разгоніць шум,
Яго ўзяў смутак моцна да няволі,
Яму яшчэ дапамагае сум.

**НЯЗВЕДАНЫ СУМ**

Я чую сум па сінім лесе,
Па вораных вясной палях,
Па сіне-светлым паднябессі,
Калі цвіла наўкол зямля.
        Цвілі зялёнымі агнямі
        Між залатых палёў лугі,
        Па іх хадзіў я і рукамі,
        Збіраў сам сена, клаў стагі.
Сумую я па той крыніцы,
З якой я піў калісь ваду,
Не замярзала і напіцца
Маглі з яе на каляду.
        Тугу я чую па дубровах,
        Дзе я калісь збіраў грыбы,
        Між жалудоў амаль багровых,
        Якія скідвалі дубы.
Сніцца мне часта бор пануры
У бляску жоўтым бліскавіц,
Як стогне ўсё ў абдымках буры,
І вые лес, як сотні львіц.
        Між сосен я іду без страху,
        Мяне ўзбуджае лесу фон.
        Прачнуўшыся не чую жаху,
        Тужу, што бачыў толькі сон.
Заўжды сумую па прасторы,
Дзе жыў, як быў я маладым,
Хоць перажыў не раз там гора,
Ды сняцца мне маі сляды.

**ЧАКАННЕ**

Жыццё чалавека на свеце
Складаецца толькі з чакання,
Чакаць ужо вучацца дзеці
Ад першых іх дзён існавання.
Чакаюць яны ўжо ў калысцы
Цудоўнага голасу матак,
Матчыных грудзей вельмі блізкіх,
І іх пацалункаў, і цацак.
Чакаюць яны многа ў школе
Ці лекцый, ці іх перапынкаў
Прагулак на луг і на поле,
А летам часоў адпачынку.
Чакаюць ізноў з нецярпеннем
Ацэнак экзаменаў школьных,
І прэмій за ўсе дасягненні,
Як нехта быў пільным і здольным.
Чакаюць сваіх атэстатаў
Студэнты чакаюць дыпломаў,
Хто доўга жыве ў інтэрнатах,
Чакае, калі будзе дома.
На службе чакаюць авансаў,
А ўсе бесрпрацоўныя працы,
Чакаюць паны рэверансаў
Ад слуг у буржуйскім палацы.
Ніхто не чакае хваробы,
Стыхіі, калецтва ці раны,
Ніхто не чакае жалобы,
Прыходзяць яны нечакана.

**Я ПАДАРОЖНІК**

Я падарожнік з мяшком на плячах,
Гэты мяшок мой напоўнены рыфмамі,
Іх па дарозе пры ўсіх гледачах
Сею паціху ўжо разам з іх рытмамі.
        Родзяць яны не заўжды нейкі верш,
        Многа іх гіне ў траве на абочынах.
        Вельмі хачу, каб іх зналі найперш,
        Там дзе радзіўся я, родная вотчына.
Часам іх вецер нясе ўдалячынь,
Родзяцца вершам ці нейкаю кніжкаю.
І да мяне прыплываюць, як плынь,
Ці прылятаюць, як рэха з задышкаю.
        Многа зславіў іх ужо інтэрнэт,
        Лёгка знайсці іх цяпер у кампутары.
        Можа чытаць на экране ўвесь свет,
        Нават у вёсцы, далёка на хутары.
Торбу нясу ўжо праз многа гадоў
І ў падарожжы не чуюся зморана,
І астаўляю не мала слядоў,
Рыфмы кідаючы ў розныя стораны.
        Торба пусцее – іх несці лягчэй,
        Хопіць аднак на гады яе змесціва,
        Як не аслепіць трахома вачэй,
        Буду раскідваць далей рыфмы ветліва.
Як апусцее мне торба зусім
У час падарожжа на нейкіх ускраінах,
Скіну яе на дыван ці кілім,
Стану тыповым ужо грамадзянінам.

## ВЯСКОВЫЯ ПЕЧЫ

Часта бачу ў маіх успамінах
Вокны ў хатах вясковых пад вечар,
Бо з іх колерам светлым кармінам
З дроў сухіх ззяў агонь з кожнай печы.
Бо займала ў іх печ паўпакоя,
І трымалася бульба пад печчу,
А на печы сяннік з асакою,
На ім грэліся косці старэчы.
Часта спалі там ноччу зімою,
Як траскучы мароз быў за хатай,
І як холад хадзіў па пакоі,
Дроў за прызбай было малавата.
Бо ў той печы варылася ежа,
І штотыдзень пяклі хлеб духмяны,
Побач комін стаяў быццам вежа
І выходзіў на дах саламяны.
Я не бачыў у нас курнай хаты,
Бачыў іх у баснійцаў у Тузлы,
З печы дым там праз вокны і краты
Плыў, як з нетраў пячор заскарузлых.
Пры тых хатах стаялі машыны,
Шэўралеты і іншыя маркі,
І выходзілі з хат тых мужчыны,
Ды машынамі ездзілі шпарка.
А жанчыны іх мелі спадніцы
Перашытыя зверху данізу,
Як калошыны дзве ў нагавіцах,
Выглядалі спадніцы паблізу.

**НОЧЧУ Ў ШПІТАЛІ**

Перад намі гарэла свяча,
Пры стале я сядзеў сам з табою,
Ззяла блузка твая, як парча,
Хоць была ты тады медсястрою.
    А на нарах у цемры наўкол
    Спалі ў ранах з-пад фронту салдаты,
    Ты давала ім часам укол,
    Як кагось з іх схапіў боль зацяты.
Расказала мне шэптам свой лёс
У медпункце ў далёкім калгасе,
На табе пасмы светлых валос
Ззялі, як аганькі на атласе.
    Я пры свечцы глядзеў у твой твар,
    У твае светлакарыя вочы,
    Бачыў пекны ад сонца загар
    І твой позірк чароўны дзявочы.
Ноч усю прасядзеў там з табой,
Развіталіся мы пацалункам,
Ты сказала, што вечар са мной
Быў прыемным табе падарункам.
    З той пары не сустрэў я цябе,
    Бо на фронт я паехаў пад вечар,
    І пасля я ў акопе ў журбе
    Бачыў вочы твае, быццам свечы.
Сустракаў я не раз цябе ў сне,
Як сядзелі мы ціха ў шпіталі,
Чуў, як ты цалавала мяне,
Чуў абдымкі твае ў цёмнай зале.

**ЦЯБЕ Я ШУКАЎ...**

Цябе я шукаў на жыццёвай дарозе,
І траціў на пошукі многа гадоў,
Блукаў і глядзеў у маркоце, трывозе,
Ці ты не аставіла недзе слядоў.
　　　Ды лёс у той час для мяне быў нямілы,
　　　Змушаў мяне сілай змяняць часта шлях,
　　　Калі мог ляцець, то завязваў мне крылы,
　　　Не мог у паветры зрабіць імі ўзмах.
Я трапіў на некалькі год у няволю,
Не мог нават думаць сустрэцца з табой,
Каб выйсці з яе, я маліў сваю долю,
Ніхто не праймаўся маёю мальбой.
　　　Цябе не сустрэў я ў ваенных прытонах,
　　　Тады ты далёка была ад мяне,
　　　Пасля я блукаў па чужынскіх загонах,
　　　Тады не магла ты прысніцца мне ў сне.
Пасля сустракаў я жанчын вельмі многа,
Нас лёс не злучыў у супольны наш шлях,
Прад кожнай паставіў ён мне асцярогу,
Паказваў, які напаткаю з ёй жах.
　　　Здарожыўся я, забалелі мне ногі,
　　　Старэў і самотны наперад ішоў,
　　　Ды лёс скрыжаваў нам дзве нашы дарогі,
　　　На тым скрыжаванні цябе я знайшоў.
Прайшоў я з табою ўжо разам паўвека,
Аб’ехалі з дзецьмі мы многа краін,
Хоць нам у жыцці памагае аптэка,
Ды цешыць нас кожны супольны ўспамін.

**РАССТАННЕ**

Газавая лямпа свеціць пры дыване,
Слухае размову смутную з табой,
І пабачыць заўтра нашае расстанне,
Хоча на хвіліну нам змяніць настрой.
    Заўтра мушу ехаць ранкам у няволю,
    І цябе аставіць, хоць не назаўжды,
    Можа ты адчуеш ад кагось патолю,
    Як чакаць захочаш доўгія гады.
Вось стаіць паблізу чамадан драўляны,
У яго ўлажыць я многа не магу,
Будзе там напэўна масла, хлеб аржаны,
Можа маці ўкіне скібку пірагу.
    Завязуць мяне з ім на перон чыгункі,
    Ды цябе не будзе там тады са мной,
    Тут пры лампе будуць нашы пацалункі,
    Сведкамі іх будуць лямпа са сцяной.
На пероне спраўдзіць вораг дакументы,
Змусіць пачакаць там на яго цягнік,
Для яго мы будзем часткай кантынгенту,
Там яго цікавіць, каб быў згодны лік.
    Як цягнік падыдзе, сядзем у вагоны,
    Нават не загляне вораг у багаж,
    Знае, што аставім родныя загоны,
    Што ў няволі ўбачым мы другі пейзаж.
Як ты згасіш лямпу ранак нам настане,
Будзе ён астатні нам упершыню,
Бо тады наступіць нашае расстанне,
Нашыя абдымкі зменяць цішыню.

**НА ЧУЖЫНЕ**

Чуюся самотны сам тут на чужыне,
І шкадую вельмі, што няма цябе,
Сам адзін тужу тут па маёй айчыне,
З кожнаю хвілінай чуюся слабей.
Мне тут не хапае родных хат, знаёмых,
Што тваёй усмешкі мілай тут няма,
Мне тут не хапае крытых хат саломай,
І пры хатах прызбаў, бо ідзе зіма.
Мне тут не хапае гукаў роднай мовы,
І што больш не чую голасу твайго,
Кожнай ноччу сняцца нашыя дубровы,
Як нясу я кветкі для цябе з лугоў.
Як злавіць мы хочам ззяючыя знічкі,
Што ляцяць над намі, дзесь над галавой,
А яны нам гінуць, бо не маюць звычкі,
Каб мы іх схапілі цёплаю рукой.
Чуюся самотны, як іду дарогай
І навокал бачу іншыя дамы,
Не магу сустрэць знаёмага нікога,
А без родных слоў тут я зусім нямы.
Не было б тугі, каб ты была са мною,
Каб тут прывітацца мог з табой штодня,
Каб у вольны час спаткацца мог з табою,
Каб нас акрыляла ночы цішыня.
Каб мог гутарыць з табой на роднай мове,
Я б не сумаваў у вольны час адзін,
Цешылі б мяне твой позірк, вочы, бровы,
Аб чужыне добры меў бы я ўспамін.

## УСПОМНІЦЕ ЖЫЦЁВУЮ ДАРОГУ

Успомніце вашу дарогу,
Якую прайшлі вы ў жыцці,
Хто даў вам калісь дапамогу,
Як сілы не мелі ісці.
Другіх папярэдзьце заўчасна
Аб розных памылках сваіх,
Аб грозных выпадках няшчасных,
Аб людзях каварных і злых.
Знаёмце малодшых аб дзеях,
Якія пазналі калісь,
Аб вашых жыццёвых надзеях,
Якія у зман увялі.
Успомніце вашых знаёмых,
Якія змянялі наш свет,
Забытых ці людзям вядомых,
І тых, што вас білі ў хрыбет.
Як помніце час міжваенны,
Тады не шкадуйце нам слоў,
Ці многа хвілін ён прыемных
Прынёс вам, ці горыч і зло.
Ці мелі вы прыкрасць, насмешку,
Як зналі, што вы беларус,
Якую паказвалі сцежку,
Які вам рабілі прымус.
Калі вы жылі ў час няволі,
То нельга забыць тых гадоў,
Хай знаюць усе ў наваколлі
І ўнукі лёс цяжкі дзядоў.

**ХАЧУ Я ДА ЦЯБЕ ЛЯЦЕЦЬ...**

Хачу я да цябе ляцець, як вецер,
А не пазнаю, дзе ж тваё акно,
Вярнулася пісьмо маё ў канверце,
Якое напісаў табе даўно.
        Яно цябе шукала дзесь па свеце
        І ўчора вось вярнулася назад,
        Здаецца, што прынёс яго мне вецер
        І ў скрынку кінуў, быццам шакалад.
І пішуць там, што ты змяніла адрас,
Ды не прыслалі мне яны яго,
І не падкажа мне яго Касандра,
Бо грэцкіх не спаткаў нідзе багоў.
        І я тужу, хацеў бы быць пракокам
        І ведаць, у якой ты старане,
        І дзе цяпер свае ты ставіш крокі,
        Ці ты зусім забыла пра мяне.
Ці сэрца там тваё, хоць на хвіліну
Адчуе вельмі радасны настрой
Былых сустрэч і кожную сцяжыну,
Якую мы прайшлі калісь з табой.
        Калі прыпомніш ты мяне ў самоце,
        Свой адрас мне прышлі хоць неўзнарок,
        Знайду цябе, як вецер, і ў спякоце
        Пачуеш пры сабе мой гучны крок.
Адкрый ты толькі раніцай ці ноччу,
Дзе ты жывеш шырокае акно,
І я, як вецер, нечакана ўскочу
У твой пакой і прынясу віно.

**ЖЫЦЁ ПЛЫЛО, ЯК СУДНА**

Плыло жыццё маё, як судна,
Яно было без мачт, без рэяў,
Плыло спакойна і марудна,
Хоць часта вецер моцна веяў.
        Калі гайдала, як бразготку,
        Не адчуваў я небяспекі.
        Было прыемна і салодка,
        Пад крыллем бацькаўскай апекі.
Трымаў глыбока ў ніжнім труме
Усе маёй душы сакрэты,
Яны ў вялікім ветра штурме
Не вылятаці рыкашэтам.
        Ды ў час ваеннай завірухі
        За судна руль рукой схапіла,
        Як нейкі д'ябал віславухі,
        Падступная і злая сіла.
Пагнала судна ў вір няволі
У невядомую краіну,
Дзе я не мог адчуць патолі
У вельмі цяжкую хвіліну.
        І доўга там між хваль крывавых
        Шукала судна шлях свабоды,
        І прыплыло з чужой дзяржавы
        На родныя ў дзяцінстве воды.
На мачце я развесіў парус,
Руль судна сам схапіў у рукі,
Праз кожную праходжу хмару,
І іх грамоў не страшаць гукі.

**БЕЛАВЕЖСКАЯ ІДЫЛІЯ**

У задуменні лес зялёны
У кветках дрэмле каляровых,
І часам зашумяць дэмоны
Паміж пялёсткаў матыльковых.
І ўспамінаюць дрэвы пушчы
Свае далёкія падзеі,
Хто тут блукаў у гэтай гушчы,
І дзе жылі тут чарадзеі,
Тут расказаў ім дуб Ягайлы,
Які яшчэ стаяў нядаўна,
Пра караля, пра Свідрыгайлу,
Як палявалі ў пушчы слаўна.
Набраўшы многа бочак мяса,
Яны з атрадамі ваяраў
Пайшлі адсюль вядомай трасай
Разбіць крыжацкую пачвару.
А многія раскажуць дрэвы
Пра царскія тут паляванні,
Пра гукі стрэлаў, крыкі, спевы,
І іх саноўнікаў змаганні.
Крывавых войнаў страшаць раны,
Амаль штодзень тут чулі стрэлы,
Хадзілі ў пушчы партызаны,
Былі тут частыя расстрэлы.
Цяпер тут ціха і спакойна,
Спяваюць птушкі, ходзяць зверы,
А аб забытых страшных войнах
Сляды жыць будуць на паперы.

**ЖАХЛІВЫ ЧЭРВЕНЬ**

Яшчэ вясенняе адзенне
На людзях бачу на двары,
Хаця прыйшло ўжо ацяпленне
Ад сонца светлага ўгары.
　　Ды вецер з поўначы струменем
　　Шукае, дзе ёсць жарало,
　　І праз шчыліны пад адзеннем
　　Стараецца прагнаць цяпло.
І ён на поўдзень ўсёй краіны
Прыгнаў навалу чорных хмар,
І паплылі з іх ручаіны
Вады, шукаючай ахвяр.
　　І заліла яна пры рэках
　　Палі, дамы, лугі, сады,
　　І ад яе жахліых здзекаў
　　Цярпелі часта гарады.
Людзей тапіла ўраз з жывёлай,
Вада прайшла праз валы рэк,
Усё спустошыла наўкола,
Дзе турбаваўся чалавек.
　　І тыднямі плыла да мора,
　　І страшыла наўкол людзей
　　Жахам чаканага ім гора,
　　Якое бачылі ў вадзе.
Прайшла навала. Хутка лета
Пачуюць нашыя палі,
А тым упісваюць дэбеты,
Каму дом хвалі залілі.

www.kamunikat.org

**ЛУЖЫНЫ**

На луг квяцісты нечакана
Прыйшла з-за лесу з ліўнем хмара,
Вада плыла з яе фантанам,
А кветкі пырскалі нектарам.
Ды хмара адышла раптоўна,
Бо вецер вырваўся дасужы,
А сонца ўсмешкаю чароўнай
Глянула зверху ў сотні лужын.
Яны ўсе ззялі бляскам люстраў,
Між кветак на вялікім лузе,
Ад ветру хвалі па іх шустра
Дрыжэлі, бегалі па крузе.
На іх блішчэлі сотні сонцаў
І кожнае на небе сінім,
І ў хвалях колеры бясконца
Змянялі кветкі ў воднай плыні.
Плывуць па лужынах аблокі
На сінім фоне, як з бавоўны,
Відаць між кветак іх падскокі,
Каб абмінуць усіх шыкоўна.
Чародкаю прыбеглі дзеці,
Бягуць ад лужы і да лужы,
І ў бляску сонца пырскі свецяць,
Як рой пялёстак цуднай ружы.
Смяюцца дзеці і нагамі
Бягуць па небу, па аблоках.
І не баяцца, што з рагамі
Глядзіць на іх бык недалёка.

**НА РЭЧЦЫ**

Плыву па рэчцы ў сонца бляску,
Вада ўся золатам блішчыць,
А збоку залатыя маскі
Трымаюць над сабой карчы.
З-пад масак тых глядзяць сапфіры,
Ці засмяецца турмалін,
І позірк бачу вельмі шчыры,
Чаруе ім, як арлекін.
Здаецца, выцягнуўшы руку,
Наловіш між дрыготкіх хваль
Каштоўных камянёў, як з бруку,
Якія ззяюць, як эмаль.
Здаецца, назбіраеш хутка
У хвалях залатых манет,
І за гадзіну, не за суткі,
Накінеш ранец на хрыбет.
Ухвалях ўсюды сонца ззяе,
Як рой каштоўных камянёў,
Вясёлкай яркай рэчка грае,
Мілёнам зорак і агнёў.
Шугае па рухавай тоні
У хвалях залацісты бліск,
Пакуль на небу сіняй гоні
Блішчыць вялікі сонца дыск.

**НЕ ВЕДАЮ, ЦІ ЗАЎТРА ЎБАЧУ**

Не ведаю, ці заўтра ўбачу
На вуліцы маіх сяброў,
Якую лёс мне даў задачу,
Ці ён мне скажа: „Будзь здароў!”
Ці заўтра нейкая хвароба
Ад ранку з’явіцца ў мяне,
Ці нечаканая жалоба,
Як ведзьма, ў хату не зірне.
Аднак я веру, што здаровы
Пакіну ранкам зноў пасцель,
Пайду на шпацыр да дубровы,
Пабачу, як лятае чмель.
Сустрэну зноў сваіх знаёмых
І з імі правяду свой час,
І што ў кавярні мне вядомай
Куплю віно, з’ем ананас.
Што ў нас не будзе землятрусу,
Не абстраляе нас лінкор,
Што не чакаецца спакуса,
Каб п’яным выбегчы на двор.
Таму мне памагае вера
Існі спакойна праз жыццё,
Не ведаючы, ці халера
Мяне параніць дзесь асцём.
Знаю, што ў свеце ўсё мінае,
Вайна праходзіць і хаос,
Не ведаючы, што чакае,
Жыву і веру ў добры лёс.

**АБСЯГ**

Змяняе час жывым істотам
Без перапынку іх абсяг,
Ён гіне ў іх падчас дрымоты,
Як усыпіў гіпнозам маг.
Істота ў руху і вяселлі
Змяняе часта свой абсяг,
Бывае ён нязменны ў келлі,
Дзе сам адзін жыве манах.
Абсяг бывае манатонны
На ціхім моры ў караблі,
Пакуль не ўбачаць бляск лімонны,
У сонцы сілуэт зямлі.
Абсяг змяняе ў падарожжы,
Ці звер жывы, ці чалавек,
Адным бывае ён прыгожым,
Другім ёсць месцам страшных здзек.
Абсяг змяняюць штохвілінна
Салдаты, што бягуць у бой,
А куляметы, як дрызіны,
Гучаць і куль кідаюць рой.
Нам пашыраюць тэлескопы
Ва Усяленнае абсяг,
А праз малыя мікраскопы
Глядзім, што робіць мікрафаг.
А тэлевізар з інтэрнэтам
Наблізілі ўвесь свет да нас,
Абсяг мы маем на планеты,
Пустыні бачым і Каўказ.

**НАРОДНАЯ ПЕСНЯ**

Розныя песні ствараюць артысты,
Чуем з іх вуснаў праз многа гадоў,
Іх паўтараюць за імі харысты,
Часта змяняюць значэнне іх слоў.
Гінуць яны дзесь глыбока ў архівах,
І забывае іх словы народ,
Новыя песны ўбягаюць імкліва,
Так як вясною ільды ў ледаход.
Толькі прыгожасцю ўжо праз стагоддзі
Вабяць народныя песні людзей,
Чуем іх гукі ў жывым асяроддзі,
Нават не гінуць у цяжкай бядзе.
Крочаць змяняюцца ўсе пакаленні,
Толькі народная песня жыве,
Бачым яе маладосць, адраджэнне,
Быццам траву на густой мураве.
Гучныя песні на розныя тэмы
Нас захапляюць і ў цемры і ўдзень.
Перажываем чужыя праблемы,
Здрады, каханне, страх і мігрэнь.
Песні чароўна спяваюць ансамблі,
Чуем мелодыі ў нашай душы,
Лётаюць гучна , як дырыжаблі,
Лечаць людзей, часта могуць смяшыць.
Цешаць мяне беларускія песні,
Бо пазнаю ў іх народны фалклор,
Грэюць, як сонца ўгары напрадвесні,
І ап’яняюць, як моцны кагор.

**ШУКАЮ...**

Забытых шукаю ўспамінаў,
Якія ўжо цяжка знайсці,
У змрочных, далёкіх краінах,
Якія спаткаў я ў жыцці.
Бо там я аставіў калісьці,
Загінуўшыя ўжо сляды.
Я нават не меў з іх карысці,
А многа вялікай бяды.
Шукаю імёны знаёмых,
Якіх там калісь сустракаў,
І меў з імі шмат мне вядомых,
Няволяй заблытаных спраў.
Шукаю зноў твары прыгожых
Забытых там мною дзяўчын,
З якімі ў пячорах варожых
Пражыў многа мілых хвілін.
Шукаю зноў назвы забытых
Мной месцаў на злой цаліне,
Дзе ў цяжкай няволі іспыты
Прымаў лёс калісь ад мяне.
Даўно ўжо змянілі іх назвы,
На картах няма іх зусім,
Шукаю, лячыў дзе я язвы,
Блукаючы ў лесе густым.
Шукаю мінулыя дзеі
З жыццёвага шляху майго,
Лясныя сцяжыны, алеі,
Дзе след астаўляў пад нагой.

**ВОБМАЦКАМ**

Часам людзі ходзяць вобмацкам па свеце,
Мацаюць ступнёю, дзе ступіць нагой,
Бродзяць, як сляпыя, не выходзяць з сеці,
У якую ўлезлі самі ці гурбой.
    Выйсці на свабоду з сеткі ўсе баяцца,
    Выйшаўшы, ўваходзяць самі ўсе ў яе,
    Вольнымі не хочуць на хвіліну стацца,
    Каб глядзець свабодна на жыццё сваё.
Вобмацкам шукаюць у злую хвіліну
Людзі дзесь паблізу ратаўнічых рук,
Каб ім памаглі папасці на сцяжыну,
На якой не чулі б клопатаў і мук.
    Вобмацкам шукалі вольную дарогу
    Людзі ў час няволі праз усю вайну,
    Не маглі знайсці там, згінула іх многа,
    Нават у царкве іх рэдка ўспамянуць.
Вобмацкам ідзём мы ў новую сучаснасць,
Бо не ведаем, што нам рыхтуе лёс,
Не заўсёды ўдзень усе адчуюць яснасць,
Не пабачаць нават, што наўкол хаос.
    І навобмацак у турмах і ГУЛагах
    Мучыліся людзі доўгія гады,
    Вобмацкам плыве жыццё ўсё ў бедалагаў,
    Іх капіталізм загнаў у гарады.
Вобмацкам праходзяць ночы ў закаханых,
Рэдка там агеньчык затрымціць свячы,
Вобмацкам дрыжаць і лечаць хутка раны,
Вобмацкам лунае час іх уначы.

**СПАДЧЫНА**

Не раз прымусіў лёс мяне
Пакінуць родную краіну,
Там бачыў спадчыну я ў сне
І мог пабачыць, ва ўспамінах.
Заўжды мне сніўся родны дом,
І рамы белыя на вокнах,
І з бліскавіцай гучны гром,
Дождж за акном, а я не мокнуў.
Таполяў пры дарозе рад
Махаў галінамі на ветры,
Над імі бліскаў зарапад,
Мігаў рой іскраў у паветры.
За хатай сніўся агарод,
Яго сланечнікі і кветкі,
І яблынь з яблыкамі ўзвод,
А за гумном ільну палеткі.
І пуня шэрая з гумном,
З саломы дах на ёй высокі,
Садок вішнёвы за акном,
Драўляны плот і роў глыбокі.
І два рады драўляных хат,
Між імі брук глядзеў шырокі,
Як ехаў воз, ён, як набат,
Грымеў прад вокнамі навокал.
За домам быў вялікі хлеў,
Былі там коні і каровы.
Такую спадчыну я меў,
Была маім вянком лаўровым.

## ХАЧУ ЎСЮ НОЧ НА ПАШЫ БЫЦЬ ВЯСЁЛЫМ

Хачу ўсю ноч на пашы быць вясёлым
З табою разам блізка ля кастра,
Глядзець, як пасвіцца ў траве жывёла,
І каб не мучыла цябе хандра.
Я смутку не хачу дарыць нікому,
Хацеў бы бачыць радасць у цябе,
Хачу, каб ты са мноў забыла стому,
Не думала аб знешняй барацьбе.
Не будзеш сварак, кпінаў чуць наўкола,
Не ўбачыш, як пляўкі ляцяць на твар,
Не будзе мучыць тут цябе назола,
Ствараючы табе штодзень кашмар.
Вось слухай шэлест ласкавы лістоты,
Як вецер шэпча ціха для травы,
Да пацалункаў набярэш ахвоты,
І кожны будзе страсны і жывы.
Захочаш запляту табе тут косы,
І пацалую ў голае плячо,
Расказваць буду розныя дзівосы,
Якія бачыў дзесь між крумкачоў.
Вясёлая, мне заспяваеш песню,
Так, што ў траве заглушыш цвыркуноў,
Успомніш, як у рэчцы напрадвесні
Лавілі мы прыгожых уюноў.
Агонь кастра асветліць наваколле,
І твой цудоўны і вясёлы твар,
Нас будзе цешыць луг, яго раздолле,
І недалёкі лес, яго гушчар.

**УЗЛЁТ І ПАДЗЕННЕ**

Пачатак у яго быў незайздросны,
Ніхто яго не ганіў, не хваліў,
У свята ён заўжды абед еў посны,
Меў на руках ад працы мазалі.
Хоць быў худы, замораны і кволы,
Не меў ён спачування у людзей,
Калі быў сыты, чуў сябе вясёлым,
І на свой лёс не скардзіўся нідзе.
Там, дзе ён жыў, змянілася пагода,
І раптам на ім крылы прараслі,
І цэраз год, ці можа за паўгода,
Ён адарваўся ўгору ад зямлі.
Ён лётаць стаў высока, быццам птушка,
Сваіх знаёмых з помсты стаў кляваць,
Ён акруглеў з худога, як галушка,
І нападаў на многіх, як сава.
Ён цешыўся, што мог лятаць высока
І зверху ўсіх суседаў напужаць,
Якія на яго злым зоркім вокам
Глядзелі, як на грознага вужа.
Прыйшоў яму раптоўна дзень панылы,
Пагода прынясла яму бяду,
Яму дождж з віхрам адарвалі крылы,
І кінулі ў балотную ваду.
Ніхто яму не выбег на ратунак,
Глядзелі, як ён топіцца ў вадзе,
І цешыліся, быццам падарунак,
Прынёс ім нехта з неба ў іх бядзе.

# ШЭДЭЎРЫ ПРЫРОДЫ

## АХОВА ПРЫРОДЫ

Калісьці змагаліся людзі з прыродай,
Вырэзвалі пушчы і лес малады
І там паўставалі палі, агароды,
Дарогі, палацы, сады, гарады.
  Яны забівалі для мяса, для скуры,
  У пушчах палюючы птушак, звяроў,
  Таму ў нас загінулі маманты, туры,
  Ніколі жывымі не ўбачым іх зноў.
Калі асушылі дзесь людзі балоты,
Там згінула многа раслін, розных рыб.
І нішчылі ў лесе пчаліныя соты,
Схаваныя ў дуплах старых дрэў углыб.
  І труцілі поле і лес пестыцыды,
  Каб згінулі ў глебе кляшчы і грыбкі,
  Ды людзі хварэлі ад гэтай агіды,
  Як пілі ваду дзесь з атрутнай ракі.
І людзі пачулі, што робяць памылку,
Як труцім прыроду, то труцім сябе,
Яна нам адплаціць такою пасылкай,
Якую пашлём для яе ў барацьбе.
  Цяпер неразумна не нішчым так лесу,
  Як нішчылі продкі яго праз вякі,
  Твараць запаведнікі там для прагрэсу,
  Дзе доўга раслі праз гады хмызнякі.
Прырода ўжо стала цяпер нашым сябрам,
Хоць многа людзей яе нішчыць далей,
Змагаюцца супраць іх многія храбра,
І поспехі іх адчуваем часцей.

**ЛЯСНЫЯ ПАХІ**

Хто з горада знойдзецца ў лесе дзесь летам,
Прыемна п’янець ён там будзе ад пахаў
Смалы і лістоты, і мёду, і кветак,
Блукаючы сцежкамі, як чарапаха.
　　Пачуе ён пахі кустоў розных ягад,
　　Якія сустрэне наўкол блізка сцежак,
　　Яны заспакояць і голад і смагу,
　　Адчуе сябе там вясёлым і свежым.
Там вылечаць пахі ад слабасці, стомы,
Ён жвава там будзе хадзіць па дарожках
І дыхаць лячэбным паветрам свядома,
Глядзець, як цудоўна бялее бярозка.
　　А п’яны ад паху ляснога паветра,
　　Захопіцца спевам і шчэбетам птушак.
　　І нават спакойныя подыхі ветра,
　　Як музыку будуць прымаць яго вушы.
Па лесе ён будзе ісці асцярожна,
Каб дзесь не параніць рукой кагось цяжка,
Глядзець пад сабою з увагай трывожна,
Каб нават не знішчыць нагою мурашку.
　　І цяжка яму будзе выбрацца з лесу,
　　Аставіць букеты і кветак і пахаў,
　　Пасля перажытага ў горадзе стрэсу,
　　Дзе меў ён не мала турбот, нават жахаў.
Ён будзе пасля ўспамінаць ап’яненне,
Якое адчуў ад лясных араматаў,
І будзе вяртацца ўспамін, як імгненне,
Як вельмі шчаслівае, дзіўнае свята.

**КЛАНІРАВАННЕ**

Чалавек разбурае прыроду,
Знішчыў многа звяроў і раслін,
Нарабіў праз вякі многа шкоды
Для прыроды на нашай зямлі.
Знішчыў тураў, ваўкоў мехаватых,
Знішчыў мамантаў вельмі даўно,
Знішчыў пушчы з жывёлай рагатай,
Ды ў навуку адкрыў ён акно.
Там пабачыў ён клеткі жывыя.
Цэраз зроблены ім мікраскоп,
Эвалюцыі іх векавыя,
І прадбачваны іх гараскоп.
Таямніцу адкрыў ён геномаў,
Генетычны пазнаў многіх код,
ДНК, ланцугі ў храмасомах
З сотняй звёнаў, як пешых узвод.
І кланіраваць стаў ён жывёлы,
Для іх лёгка тварыць блізнюкоў,
І шукаць стаў ён генаў наўкола,
Каб кланіраваць тураў-быкоў.
Паявілася нават задума,
Каб знайсці недзе мамантаў ген,
І зрабіць з яго клон, і без шуму
Паказаць яго людзям удзень.
Думкі ёсць кланаваць дыназаўраў,
Як дзесь знойдуць іх гены ў нары,
І другіх паўзуноў іхтызаўраў,
Каб стварыць парк жывёл аж з юры.

**ПЯРЭСНА**

Вясна запрашае ўжо лета
Прыйсці ў Белавежскую пушчу,
Каб спеўнае птушак лібрэта
Мацней чуць было ў кожнай гушчы.
Яшчэ не даспелі чарэшні,
На полі зялёнае збожжа,
Вялікія кветкі пярэсны
Чаруюць на сонцы прыгожа.
Аранжавы колер з чырвоным,
Між дрэваў гайдаюцца ў лесе,
Як быццам руж пекных загоны
Упалі сюды з паднябесся.
Зайздросцяць ім цёмныя сосны,
Паблізу дубы і бярозы,
Злуе нават куст кветаносны,
Які не баіцца марозаў.
Зайздросцяць, што часта дзяўчыны
Зрываюць чырвоныя кветкі,
Зайздросцяць, што голас пчаліны
Ляціць праз пярэснаў палеткі.
Іх цешыць, калі называюць
Іх замест пярэсны, купавай,
І ўсе нецярпіма чакаюць,
Аж прыйдзе тут хлопцаў арава.
Яны пазрываюць тут ружы,
Патопчуць прыгожы палетак,
І будзе тут пляц, як па сцюжы,
Пусты: без раслін і без кветак.

www.kamunikat.org

**ПАВУК**

Расцягвае ён сетку павуціны
Паміж сукоў, галін, лістоў, іголак,
І мучыцца праз доўгія гадзіны,
Каб потым сесці і глядзець наўкола.
На зыбкай вязі ўласнай цяжкай працы
Чакае ён ахвярыу, быццам кат на пляцы.
Як затрасецца нітка павуціны,
Зрываецца, шукаючы ахвяры,
І да яе бяжыць праз кулуары,
Каб атруціць яе сваёю слінай.
Членістаногі кат без спачування
З'ядае ўсіх, хто пападае ў пастку,
Як толькі дабяжыць, то без вагання,
З іх высысае кроў, іх рве на часткі,
Заўжды смяротныя трымае джалы,
Бо павукі, то каты-канібалы.
Іх самкі ўсе сваіх з'ядаюць самцаў,
Калі аплодняць іх сваім насеннем,
Ад смаку самца чуюць захапленне,
Шукаюць з'есці іншага пасланца.
Дыктатары, як павукі, ў дзяржаве
Расцягваюць навокал павуціну.
Паліцыя, іх карныя заставы
Ахвяр шукаюць кожную хвіліну.
Яны глядзяць на пасткі, як удавы,
Каб паглынуць кагосці ў дзень аблавы.
Для непакорных маюць турмы, сылкі
І лагеры, суды іх шлюць на плаху,
У кожнага шукаюць дзесь памылкі,
Каб іх трымаць у роспачы і страху.

**ВЕРБЫ НАД РАКОЮ**

Рад вербаў нахіліўся над ракою,
Лістотай паглядаюць на ваду.
Іх чуць, як нешта шэпчуць між сабою,
Прыгожыя, як яблыні ў саду.
    Глядзяць, як рыбы плаваюць пад імі,
    І як сваволяць часта між сабой,
    І цешацца істотамі жывымі,
    Якіх яны прыкмецяць над вадой.
А над вадой лятаюць часта птахі,
Якія ловяць мух і камароў,
Лістота чуе крылаў іх узмахі,
Багаты побач бачыць іх улоў.
    Ім блізкім стаў чароўны спеў птушыны,
    Як толькі ўзыдзе сонца над ракой,
    Іх слухаюць праз доўгія гадзіны
    З растучай побач вербаў асакой.
На нейкіх вербах унутры лістоты
Схавалі птушкі не адно гняздо,
Там скача многа птушак жаўтаротых,
Між вераб'ёў і шэранькіх драздоў.
    Прыемна пасядзець у вербаў ценю,
    І адпачыць спакойна ў халадку,
    Там згінуць хутка болі ад мігрэні,
    Без лекаў, без пілюлі, парашку.
Там будзеце сябе чуць, як у раі
Калі наўкол спявае птушак хор,
І думаць, што анёлы вам спяваюць,
А купал неба, то святы сабор.

**ПРЫЙШЛА ДА НАС ВЯСНА**

Прыйшла да нас вясна,
Якую ўсе чакалі,
Ад ранку дапазна
Блішчыць свет, як каралі.
    Цвітуць наўкол сады
    І кветкі ў агародах,
    Прапалі халады,
    І цешыцца прырода.
Даўно загінуў снег,
Адтаялі палеткі,
І вараслі наспех
На іх усюды кветкі.
    І зацвілі лугі
    Вясёлкаю чароўнай,
    А на палях плугі,
    Баразны сцелюць роўна.
Спяваюць салаўі
У небе над палямі,
А песняў ручаі
Плывуць наўкол над намі.
    А з кветак пчол раі
    Нектар, пылок збіраюць,
    І ў вулеях сваіх
    Ім соты напаўняюць.
У светлае красе
Прыходзіць асалода,
Бо захапляе ўсіх
Вясенняя прырода.

www.kamunikat.org

**ДРАЧЫ**

Помню ў вёсцы за клуняй суседа
Дзесь у чэрвені ўдзень і ўначы,
Як на лузе вялася бяседа
Сотні птушак, вялі рэй драчы.
Быццам пілкай хтось рэзаў паветра,
Чуць было ў кожнай хаце ў сяле.
Скрогат іх прыбягаў да нас з ветрам
Нават ранкам у шэрай імгле.
Дзяркачамі ў нас іх называлі.
Іх самцы верашчалі мацней,
Самак гнёзды рабіць запрашалі,
І сядзелі ў іх потым цішэй.
А каштанавы колер іх крылаў,
Як у люстры блішчаў у вадзе,
Асабліва, як сонца свяціла,
Не было хмар на небе нідзе.
А пасля луг зусім асушылі,
Адплыла дзесь у рэкі вада,
І заціхлі драчоў вадэвілі,
Засталася па іх спагада.
А на лузе трава па калена,
Узышла, як зялёная рунь,
І праз чэрвень касілі ўжо сена,
Там дзе плаваў калісьці акунь.
А пасля ўдзень скакалі там коні,
Як у вырай ляцелі драчы,
Апусцелі паблізу ўсе гоні,
З лесу вухкалі нам пугачы.

**ВАЛОШКІ**

Мне прысніліся ў жыце валошкі,
Як збіраю з дзяўчатамі іх,
І якззяюць іх вочы, як брошкі,
Чую звонкі іх смех, ціхі ўздых.
    Неба сіняе зверху нас сочыць,
    Як сінеюць у іх васількі,
    І як ззяюць іх сінія вочы,
    Як лятаюць наўкол матылькі,
І дзяўчатак я бачу такімі,
Як быў з імі калісь маладым.
Я хацеў бы сустрэць іх жывымі,
Ды загінулі ўсе іх сляды.
    Бо вайна нас раскінула ўсюды,
    Іх пагнала ў чужыну даўно,
    Успамінаў аб іх ізумруды
    Свецяць мне, быццам сонца ў акно.
Бо прыпомніцца родная вёска
І забытая ўжо маладосць,
Сіняватыя ў жыце валошкі
І айчыны маёй прыгажосць.
    Як калісь я збіраў з імі кветкі,
    Як прыносіў у жменях дамоў
    І ў вазон устаўлях ці да сеткі,
    І сушыў іх, хаваў іх у схоў.
Як з дзяўчатамі ў лесе пры соснах
Мы плялі з розных кветак вянкі,
І як ткалі палотны на кроснах,
Як ляталі ў руках чаўнакі.

**БАКЛАНЫ**

Глыбокае возера, светлы экран,
На сонцы блішчыць, як на небе вясёлка,
Пад сцежку маю, дзе расце дурнап’ян,
Прысеў, прыляцеўшы, вялікі баклан,
Стаяў не баяўся, што ён вельмі колкі.

Загадкава ён паглядаў на мяне
І колерам сталі свяціліся крылы,
Як рыцар з мячом дзесь сядзеў на кані,
А вочы гарэлі ў яго, як агні
Гарачых вуглёў у царкоўных кадзілах.

Стаяў нерухома і дзюбы кручок
Паднёс ён высока, як меч, або піку,
І страшыў мяне, каб я часам свой крок
Не паставіў на сцежцы на белы пясок
Паблізу яго, бо аглухну ад крыку.

Я убачыў тады ў дурнап’яне гняздо,
Яго пільнавала адважная самка,
Скруціла з галін яго, як з правадоў,
Яно мела ў зелені колер бардо,
Мажліва, што ўжо палажыла ў ім яйка.

Яшчэ прыляцеў на падмогу самец,
І разам стаялі, глядзелі злосліва,
Калі небяспекі надыдзе канец,
Калі іх аставіць якісьці ганец,
І будуць ізноў лавіць рыбу імкліва.

І я зразумеў невымоўны іх страх,
Каб я не забраў іх гнязда з дурнап’яну.
Змяніў я ля возера шпацыру шлях,
І хутка крылаты пачуў там узмах,
Пабачыўшы два сілуэты бакланаў.

**ПЧАЛА**

Лятае пчала і цалуе на лузе
Між травамі кветкі ў прыгожых сукенках,
Хацела б засесці на яркім жэмчузе,
Які носяць часта ў каралях паненкі.
Яна быць не хоча ў абдымках рамонку,
Нектар яна любіць у кветках салодкі,
Яго ён не мае, таму лапкай звонку,
Кранула яго раз на момант кароткі.
Цяпер палюбіла яна медуніцу,
Нектар вось даюць ёй ружовыя кветкі,
І шэпча яна ёй сваю таямніцу,
Якую сказалі ёй рана палеткі.
На ёй ап'янела ад моцнага паху,
Абсыпаў пылок яё цела наўкола,
Сарвалася з кветкі раптоўна з размаху,
І хутка ляціць у свой вулей вясёлы.
Там выліла мёд у маленькія соты
І зноў паспяшала на поле за рэчкай
Знайшла там па паху без цяжкай турботы,
Вялікі палетак абсеяны грэчкай.
Бялеў ён ад кветак, і пахла навокал,
Пчала кожнай кветцы расказвала казкі,
Сядала на кожную зверху, як сокал,
Нектар выпівала салодкі і вязкі,
Заносіла ў вулей яго і да ночы
Лятала між вулеем, грэчкавым полем,
Як ноч надышла, то, заплюшчыўшы вочы,
І ў сне аглядала лугоў наваколле.

**ЖУРАЎЛІ**

Хоць яшчэ не аставіла вёсак зіма
І бялеюць пад снегам навокал палі,
Ды ляжыць снежны пух у садах, на дамах,
А па лузе шагаюць ужо жураўлі.
Прыляцелі дзесь з поўдня, з далёкіх краін,
Стуль дзе сонца гарачае ззяе ўвесь дзень,
Тут шукаюць пад снегам зялёных раслін,
І знаходяць пад лёдам з вадою струмень.
І калі ўжо пачуецца подых вясны,
І не відна на лузе зімовых слядоў,
Гадавы шлюбны танец пакажуць яны,
І пачнуць будаваць у чароце гняздо.
Спадабаўся так людзям іх танец без слоў.
Што ў балетах танцуюць на сцэнах яго,
Імітуюцца рухі жывых жураўлёў,
Іх падскокі і ўзмахі іх крылаў з нагой.
Падагрэюць два яйкі яны па чарзе,
Даглядаюць дзяцей разам з самкай самец,
Разам вучаць хадзіць іх па гразкай вадзе,
І шукаць, дзе знаходзіцца жук-плывунец.
Грозных ворагаў маюць яны на лугах,
Бо іх гнёздаў шукаюць лісіцы, ваўкі.
І таму, калі спяць, то стаяць на нагах,
Ці хаваюцца ўдзень у гушчар асакі.
А на восень збіраюцца ўсе ў табуны,
На нарадах праводзяць тады доўгі час,
І ўсе ў вырай ляцяць, сфармаваўшы кліны.
На пачатку вясны, каб вярнуцца да нас

**КІНЬЦЕ ГАРАДСКІЯ СЦЕНЫ**

Кіньце гарадскія сцены,
Іх куродым, духату,
І ў абдымках хваль і пены
Забывайце душнату.
    Удыхайце пырскі ёду,
    Хай бушуе ў жылах кроў,
    І захвальвайце пагоду,
    Не спяшайце да дуброў.
Выглядайце ў моры судны,
Як падходзяць пад прычал,
На пляж гучны, мнагалюдны,
Як не страшыць мора шквал.
    Можна тут гайдацца лодкай,
    Аднаму плысці пад буй,
    Бераг вымераць паходкай,
    Выпіць віскі, як буржуй.
Загарайце ўдзень на пляжы
І купайцеся ў вадзе,
Неба чыстае без сажы
Вас прымусіць маладзець.
    Маладых дзяўчат ёсць многа,
    Каб сяброўку тут знайсці,
    З ёй забыць усе трывогі,
    Клопаты ў сваім жыцці.
У каго ёсць толькі сілы
І ад працы вольны час,
Кіньце гарадскія вілы,
Мора тут чакае вас.

**ЗЯМЛЯ**

Гляджу вось на сад, як квітнеюць там дрэвы,
Якія пад восень дадуць нам плады,
І слухаю птушак прыгожыя спевы,
І бачу, як цешацца ў садзе дразды.
    На лузе смяюцца чароўныя кветкі,
    На полі ўзараная ззяе ралля,
    На дрэвах блішчаць павуцінныя сеткі,
    Здаецца, што ў раі цвіце ўся зямля.
Ды знае зямля тарфяныя балоты,
Амаль не даходзіць туды чалавек,
Пустыні ў абдымках нязноснай спякоты,
Дзе толькі чакаюць магіла і здзек.
    Вялізныя тундры з пустой мерзлатою,
    Дзе лесу не відна, дзе мала травы,
    Трапічныя джунглі з лістотай густою,
    З якой чалавек рэдка выйдзе жывы.
І Арктыку ўсю з Антарктыдаю ў лёдзе,
Дзе страшаць замёрзлыя горы вады,
Дзе нават пры сонечнай летняй пагодзе
Знайсці вельмі цяжка жывыя сляды.
    Аднак ці хтось знойдзе другую планету,
    Дзе лепш бы было, як на нашай замлі?
    Ракеты лятаюць даўно па сусвету,
    Не могуць знайсці, дзе цвілі бы палі.
Прысела ракета калісь на Венеру
Праверыць, ці вырасце там кіпарыс,
Сустрэла раптоўна ў яе атмасферы
Жахлівую спёку, яе страшны ціск.

# АНАМАЛІІ ЖЫЦЦЯ

## ЛЮДЗІ СТАЛІ, ЯК БЯРВЁНЫ

Людзі сталі, як бярвёны,
Сэрцы ў іх не чуюць болю,
Ведаючы, што мільёны
Дзесь людзей жыве ў няволі.
Не цікавіць іх, што міны,
Выбухаюць у Кабуле,
І што кожную хвіліну
Гіне нехта дзесь ад кулі.
Зла багатыя не чуюць,
Што стварылі беспрацоўных,
Іх сумленне не турбуе,
Што наўкол галодных поўна.
Што ў мароз і ў сцюжу гіне
Многа бедных і бяздомных,
Што пратэст расце ў краіне
Між работнікаў наёмных.
Аб карупцыі, разбоі
Весткі чуем, як гром з хмары,
А зладзеі, як героі
Ходзяць, не баяцца кары.
Багацеюць коштам бедных,
Коштам гвалтаў незлічоных,
Чуюцца ў прытонах медных,
Як бяздушныя барвёны.
Іх не страшыць плач убогіх,
Плач бяздомных і галодных,
Прагнасць іх не знае Бога,
Бо для іх Ён невыгодны.

**ЦІ СОРАМНА ВАМ, БАРАЦЬБІТЫ?**

Ці сорамна вам, барацьбіты,
Бяздомных сустракаць цяпер?
І бачыць, як вакол бандыты
Дайшлі да славы, да кар’ер?
    Не сорамна вам, што зімою
    Замерзла сотні тры людзей?
    Што беспрацоўныя гурбою
    Стаяць за супам у чарзе?
Не сорамна, што моладзь наша
Шукае хлеба за мяжой,
Бо ўлады беспрацоўем страшаць,
А ноччу жулікі нажом?
    Не сорамна, што дзеці ў школу
    Штодзень галодныя ідуць,
    Бо многа іх бацькоў наўкола
    Не маюць грошы на яду?
Як вы даходзілі да ўлады,
Што абяцалі ўсім тады?
Ці адчуваеце спагаду
Да тых, хто мёрзне ў халады?
    Як вы ўзышлі на п’едэсталы,
    Ці бачыце бяду згары?
    І за якія ідэалы
    Змагаліся, вы, змагары?
Цяпер, калі вы ўзбагацелі,
Вас не цікавяць бядпякі.
Вам цёпла ў хаце і ў пасцелі,
Таўсцеюць вашы кумпякі.

**КАГО ВІНАВАЦІЦЬ?**

Каго вінавацiць, што ў нашай краiне
Амаль не пачуеш саваёй роднай мовы?
Што родная мова ў чужой мове гіне,
Што ў нас на яе налажылі аковы?
Як бачым ва ўсіх пастсавецкіх краінах
Іх родныя мовы дзяржаўнымі сталі.
У Латвіі чую, ў Літве, ў Украіне
Даюць за іх ордэны славы, медалі.
Пачуць іх там можам усюды, наўкола,
Ва ўсіх іх парламентах, іх установах,
Там вучаць іх родныя мовы ў іх школах,
Прамовы ўсе ўлад іх гучаць на іх мовах.
І толькі ў нас родная мова ў пагардзе,
Яе дыктатура зрабіла вясковай,
Каб мова чужая была ў авангардзе,
Назвалі яе беларускаю мовай.
І грэбуюць ёю ва ўсіх установах,
Не хочуць на ёй гаварыць члены ўлады,
Са школ выкідаюць яе паступова,
Стараюцца знішчыць яе без спагады.
Чужынцы, што ўлады схапілі ўсе стырны,
Якія наехалі ў час дыктатуры,
Народ наш стараюцца вызваліць мірна,
Ад мовы дзядоў нашых, нашай культуры.
Гавораць, што мы ўсе адзіным народам
Былі нават з імі ў час горкай нягоды,
І нішчаць нам родную мову для згоды,
Каб мы не хацелі ад іх мець свабоды.

**МАРЫЯНЕТКІ**

Марыянетак многа ёсць ля нас навокал,
Якія скачуць так, як цягнуць іх шнуркі,
Міргаюць нам адным ці другім вокам,
У такт кіруючай іх танцамі рукі.
Яны танцуюць толькі па загаду,
Так як схаваны імі гойдае акцёр,
І маюць моцную над намі часта ўладу,
Змушаюць слухаць іх, трымаючы тапор.
І за шнуркі іх часта цягнуць за мяжою,
Дакладна так, як будзе выгадна для іх,
Кіруюць намі з-а мяжы сваёй рукою,
І робяць з нас яны нявольнікаў сваіх.
Змушаюць нас, каб высылалі мы салдатаў,
Дзесь на далёкую і цяжкую вайну,
Там да людзей страляць нам кажуць з аўтаматаў,
Хаця ў нас доказаў няма пра іх віну.
А часам абарвецца дзесь шнурок знянацку,
Якім акцёр кіруе ў нас ці за мяжой,
Сама марыянетка скача па-мастацку,
Лепш, чым раней акцёр змушаў яе рукой.
І нейкі час яна танцуе самастойна,
І захапляюцца ёй нават чужакі,
Акцёр аднак шукае неспакойна,
Вяроўкі адарванай ад яго рукі.
Яе прывяжа, як жывёліне аброжак,
Каб не старалася яму даваць адпор.
Марыянетка самастойна жыць не можа,
Ёй мусіць кіраваць схаваны дзесь акцёр.

**БЕЗ СОРАМУ**

Пасля войнаў сусветных крывавых,
Там, дзе бізнес стаў людзям апорай
Для багацця, кар'еры і славы,
Адабраў у іх гонар і сорам.
　　Людзі трацяць з-за грошай сумленне,
　　Абкрадаюць другіх і дзяржаву,
　　Як іх зловяць, то чуюць здзіўленне,
　　А сумленнага лічаць разявай.
Не саромяцца цёмнай халтуры,
Для яе абражаюць знаёмых,
І ствараюць наўкол авантуры,
Ды паклёпы кідаюць свядома.
　　Не саромяцца грошай більёны
　　Браць у год за халтуру ў палацах,
　　Як наўкол беспрацоўных мільёны
　　Галадаюць без дома, без працы.
Расхваліць не саромяцца погань
За кусок пірага, за заслугу,
І не бачаць нічога ў тым злога,
Як нявінны караецца пугай.
　　Не саромяцца бедных, бяздомных
　　Заахвочваць да новых парадкаў,
　　На заводах рабочых наёмных,
　　Грабіць хітрым бязглуздым падаткам.
Паявіліся хеўры, бандыты,
Не для славы і не для кар'ры.
Для разбою, для ўласнага спрыту
Без сумлення жывуць, горш як зверы.

www.kamunikat.org

**МАНІЯ ЎЛАДЫ**

Не магу зразумець тых людзей, што для ўлады,
Аддаюць некрытычна свой час і жыццё,
Для яе любяць святы, ману і парады,
І бязмерна іх цешыць яе здабыццё.
Для яе будуць лгаць, абяцаць для наіўных,
Ім палепшыць жыццё і шукаць слухачоў,
І падлізнікаў верных і хітрых пасіўных,
І ствараць многа выгад для ўсіх лаўкачоў.
Рэжа слых дэмагогія іх з папулізмам,
У праціўнікаў заўжды шукаюць віну
За няшчасці людзей, недахоп гераізму,
За стыхійныя бедствы, чужую вайну.
На сапернікаў сыплюць ману і паклёпы,
Каб іх ганьбіць, зняславіць між розных людзей,
А інтрыгамі цёмнымі робяць падкопы,
Насылаюць да іх пракурораў, судзей.
Часта манія ўлады вядзе да злачынства,
Забіваюць сапернікаў грозных сваіх,
І шукаюць віну ў іх яшчэ ад дзяцінства
У старэйшых братоў і ў бацькоў нежывых.
Былі монстры, якія, дайшоўшы да ўлады,
Не хацеўшы нікому аддаць свой алтар,
Вінавацілі ўсюды людзей за іх здрады,
Па сабе астаўлялі мільёны ахвяр.
Не баяцца яны, што не будуць жыць доўга.
І што ўладу ім смерць забярэ назаўжды,
Што асудзіць гісторыя ўчынкі іх строга,
Што іх будуць пасля праклінаць праз гады.

**НЯНАВІСЦЬ**

Многія ведаюць тое, што ведаць хацелі,
Іншыя веды ўжо іх не цікавяць зусім,
Злу навучылі ўсіх іх ад дзіцячай пасцелі,
Будзе яно ўжо да смерці ў іх сэрцы жывым.
Будуць яны ненавідзець другога заўсёды,
Нават тады, як ён будзе зычлівы для іх,
І абкладваць грахамі другія народы,
Не прызнаваць ні грахоў, ні памылак сваіх.
Іх ксенафобія стала жыцця атрыбутам,
Ворагам стаў для іх кожны сусед за сцяной,
Погляд другі, чым яны прызнаюць, то атрута,
Праўду яны называюць заўсёды маной.
Ходзяць яны памаліцца не раз у касцёлы,
Толькі грахоў не забудуць ніколі чужых,
Будуць зайздросціць усім багацейшым наўкола,
А на бяднейшых з пагардай сычаць, як вужы.
Сораму ў сэрцы не чуюць, як сыплюць паклёпы,
Як абліваюць балотам спакойных людзей,
Як карыфея навукі завуць асталопам,
І як даносы ілжывыя шлюць да суддзей.
Бачым нянавісць палае ў салонах улады,
Гучныя чуем паклёпы, крамолы адтуль,
У тэлебачанні бачым іх жорскія звады,
Каб захапіць за дзяржаўны кіруючы руль.
Творыць нянавісць паміж людзьмі войны,
Гіне з нянавісці многа людзей у няволі,
Творыць яна тэрарызм, многа ран незагойных,
Дзе ёсць нянавісць, там згоды не будзе ніколі.

**СЕМЯНОЎСКАЕ ВАДАСХОВІШЧА**

Там дзе цяпер азёрныя бліскаюць хвалі
І дзе маторкі часам патрывожаць глуш,
Раслі на дне ў садах на дрэвах, як каралі,
Плады прыгожых вішань, яблыкаў і груш.

На дне вады было калісьці восем вёсак
І ў іх жылі сяляне доўгія вякі,
З іх нёсся беларускіх песняў адгалосак,
Штовечар аж да Нарвы, роднай іх ракі.

Палі там абсявалі і расло там збожжа,
Вясной цвілі там агароды пры дамах,
І рамяство там развівалася прыгожа,
На санках ездзілі, калі была зіма.

Дзяржава змусіла сялян прадаць дабытак:
Усе палі, дамы, хлявы, ўсе пуні і сады,
Іх з вёсак выгнала, як пан калісь наймітаў,
У сёлы блізкія, ці дзесьці ў гарады.

Разбураныя хаты ўсе і зрэзаныя дрэвы,
Фундаменты дамоў засыпалі зямлёй,
Там дзе лясы былі, палі ўсе пад пасевы,
Са знішчанымі вёскамі, ўсё залілі вадой.

Цяпер іх вёскі аглядаюць зверху рыбы,
Якія плаваюць над імі наўздагон,
На дне ляжаць каменныя навокал глыбы,
Зялёна-сінія, як у вадзе планктон.

А жыхары, якія выйшлі з роднай вёскі,
Тут могуць памаліцца блізка ля вады,
Ці з вудаю прыйсці і ў ваду кінуць лёску,
Злавіць дзесь рыбу і забраць дамоў з нуды.

**НАМ НЕЛЬГА ЖЫЦЬ З ЗАКРЫТЫМІ ВАЧЫМА**

Нам нельга жыць з закрытымі вачыма,
Не бачыць зла, што творыцца наўкол,
І гаварыць, што ўсё ў жыцці магчыма,
Хавацца за замкнёнымі дзвярыма,
Ці дзесь даваць на зло ў жыцці дазвол.
Глядзі, дзе ў свеце ёсць несправядлівасць,
І дзе бандыты мучаць, б'юць людзей,
Дзе нішчаць ім дамы, палі і нівы,
Іх абкрадаюць ціха і зласліва,
Крычы і насылай на іх судзей.
Не бойся іх, твой страх, твая нясмеласць
Іх падбадзёрвае да грабяжоў,
Бо з-за яе мы чуем плач і стрэлы,
Іх п'яныя і грозныя капэлы,
Там гінуць людзі і там льецца кроў.
Сачыць нам трэба праніклівым зрокам
Дзяржаўных верхаводаў крыкуноў,
І розных дэмагогаў, лжэпрарокаў,
За кожным іх намерам, кожным крокам,
Каб нам на рукі не заклалі кайданоў.
Нам нельга ціха жыць, калі тыраны
Няволяць у дзяржаве грамадзян,
За іх пратэсты задаюць ім раны,
У турмах іх трымаюць закаваных,
І дапускаць, каб здзекваўся тыран.
Нам нельга не крычаць, як акупанты,
Далёка нішчаць дзесь чужы народ,
Высаджваюць там карныя дэсанты,
Дамы іх паляць, іх крадуць брыльянты,
Ім астаўляюць попел і смурод.

**НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ І СВАБОДА**

Дзяржаву характарызуюць часта словы,
Ці мае незалежнасць і свабоду,
Бо гэта не сінонімы два ў мове,
А розныя значэння для яе народу.
    Бо незалежная дзяржава не заўсёды:
    Дае свабоду слова для свайго народу,
    І іншыя дэмакратычныя свабоды,
    На выбар вольны ўлады выражае згоду.
Бывае часта, што ў дзяржаве незалежнай,
Улада закабальвае народ свой у няволю,
А ён палае да яе ненавісцю бяззмежнай,
Стараецца пазбавіцца ярма нядолі.
    Свабода і адмоўнаю бывае для дзяржавы,
    Калі прыводзіць да анархіі, бяспраўя,
    Як нішчыць незалежнасці галоўныя падставы.
    Уводзіць фанатызм, і топча раўнапраўе.
Нам нельга даць свабоды тэрарыстам,
Забойцам, злодзеям і паразітам,
І дапускаць да агітацыі фашыстаў,
І не судзіць, і не караць бандытаў.
    Нам нельга памагаць уладам у дзяржаве,
    Дзе ў кіпцюрах народ трымае дыктатура,
    Там дзе пануе дыспатызм, бяспраўе,
    А на свабоду слова ўведзена цэнзура.
А трэба памагаць заўжды яе народу,
Каб вызваліўся сам з свайго ярма няволі,
Каб знішчыў дыспатызм, пачуў свабоду,
Не страціў незалежнасці ніколі.

**АПТЫМІСТ**

Ён бачыць свет у барвах ясных,
Кіруе ім святло жыцця,
Не чуецца ў жыцці няшчасным,
Не знае ў сэрцы ён ныцця.
Ён чуе радасныя песні,
Мінае смуткі, кожны страх,
Як сонцаззяе напрадвесні
Душа яго ў чароўных снах.
Ён цешыцца з вясёлых вестак,
А злыя забывае ўміг,
Ён не прымае злых павестак
І смутных недарэчных кніг.
Ён бачыць у жыцці дарогу
Без злых равоў і перашкод,
Яе праходзіць без трывогі,
Як напаткае недзе брод.
Заўжды прадбачыць ён здалёку
Сам небяспеку за вуглом,
І абыдзе яе без шоку,
Праз беды пройдзе напралом.
Ён доўга можа жыць спакойна
Без стрэсу грознага ў жыцці,
І пражыве ён самастойна
Гадоў не мала ў забыцці.
Аб аптымісце ўспомняць толькі
Як дажыве ён сто гадоў
І затанцуе пры іх польку
Без бачных старасці слядоў.

## ХВОРЫ НА ХВАРОБУ АЛЬЦГЕЙМЕРА

Яшчэ недаўна быў здаровы,
Быў сябрам мілым, паважаным,
Ляцелі з вуснаў часта словы,
Як красамоўныя фантаны.
Ён жартаў не шукаў у схоўку,
А досціпаў ён меў без ліку,
Нічога не рабіў без толку,
Спакойна працаваў, без крыку.
Цяпер змяніўся ён раптоўна,
Сядзіць у хаце асавелы,
Глядзіць навокал бяссэнсоўна,
Без радасці, закасцянелы.
Устане з крэсла, быццам п'яны,
Пачне хадзіць сам па пакоі,
А думкі ў ім, як тараканы,
Сабраліся і ўюцца роем.
Урыўкі старых успамінаў
Стаюць рэальнасцю магчымай,
І думак дзіўных блытаніна
Паказваецца прад вачыма.
Галюцынацыі навокал
Яму ўжо не даюць спакою,
І здань лятае, быццам сокал,
Амаль над самай галавою.
Не пазнае дзяцей і жонкі,
Нікога між сваіх знаёмых,
Не чуе ўжо людской гамонкі,
Усё стаецца невядомым.

# ЛЮДСКІЯ СЛЯДЫ

## ЛЮДСКІЯ КРОКІ

Гучаць вякі людскія крокі,
Яны заўжды ідуць наперад,
Плывуць, як рэкі і патокі,
Мінаюць скалы і бар'еры.
        Іх часам дзесь затрымаць можа
        Вайна ці грозная стыхія,
        Змяніць кірунак ім паможа,
        Каб абысці лясы густыя.
І гукі чуюцца тых крокаў
На ўсёй зямлі, на ўсёй планеце,
І ў космасе іх чуць высока,
Ракеты крочаць па сусвеце.
        Пачулі ўжо людскія крокі
        На дне глыбока ў акіяне,
        Пачуў іх месяц паўнашчокі
        Не на адной сваёй паляне.
Пачулі іх ў зямных пячорах,
Куды і звер не можа ўлезці,
Высокія іх чулі горы,
Як на Казбеку, Эверэсце.
        І іх пачуюць нашы ўнукі,
        Яшчэ і на другіх планетах
        Людскіх адважных крокаў гукі
        Нам праз эфір прышлюць з каметы.
Калі не знішчыць нас стыхія,
То гукі нашых крокаў скора
У космас даляцяць жывыя
Да невядомай нам прасторы.

**ЧАЦВЁРТАЕ ВЫМЯРЭННЕ**

Калісь шукалі людзі раю
Высока дзесь за шэрай хмарай,
Там душы праведных у гаю
Шчасліва мелі жыць без сварак.
Шукалі пекла пад зямлёю,
Дзе душы грэшнікаў за кару
Гарэлі ў баках са смалою
І задыхаліся ад жару.
У раі лёталі б анёлы
І песнямі хвалілі Бога,
У пекле чэрці, як назолы,
Любілі б мучыць да знямогі.
Аднак ракеты, тэлескопы
Не выкрылі на небе раю,
А салякопы, вуглекопы
Чарцей нідзе не сустракаюць.
Хоць маем пад зямной карою
Глыбока агнявую лаву,
Якая часам над гарою
Прарвецца языком крывавым.
Ды чэрці з ёй не вылятаюць,
Не можа пеклам быць для грэшных,
І ў космасе не бачым раю
Між зорак і планет нябесных.
Вучоныя знайшлі ў прасторы
Чацвёртае дзесь вымярэнне.
Мо' там ёсць гай, лугі і горы?
Мо' там ёсць рай і пекла сені?

**ГРАМНІЦЫ**

Сёння свята Перуна.
Бог язычніцкі жыве,
Як бог маланкі й агня,
З святам Срэчання ў царкве.
Перад святам селянін
З воску, што раней збіраў,
Патаемна сам адзін
Свечку ноччу выплаўляў.
Асвяціў яе ў той дзень,
Каб пасля мець амулет,
Каб святла яе прамень
Бараніў яго ад бед.
І агнём ад той свячы
Крыж рабіў у валасах,
Так, каб цела не спячы,
У жывёлы на хрыбтах.
Ён грамніцай называў
Асвячоную свячу,
І яе ўвесь год хаваў
У шаўковую парчу.
Ён лічыў, што ў гэты дзень
Лета прыйдзе да зімы,
І яе разгоніць цень,
І блісне, як сонца з цьмы.
Што кульгаючы яна,
Пакідаць пачне іх зноў,
А чароўная вясна
Прыйдзе з квеценню садоў.

**СПАКВАЛЯ**

Калісьці ў мінулых забытых вяках
Агністаю глыбай шугала Зямля,
З вулканаў плыла па ёй лавы рака,
Гарэла і стыла мільярды гадоў.
Зямною карою з гарачай вадой
Яна пакрывалася ўся спакваля.
    На ёй астывала паволі вада,
    Узніклі з яе акіяны пасля,
    І вецер, і буры, і хваль грамада.
    Вада ў акіянах стварыла бялок
    Ён зліўся ў амёбы чароўны клубок,
І ў хвалях узнікла жыццё спакваля.
Жыццё з акіяна знайшло мацярык,
Узніклі на ім і расліны, і тля,
І доўга лясы чулі яшчараў рык.
Як згінулі яшчары ў гушчы лясоў
З’явіліся птушкі і многа звяроў,
І ўрэшце, як цуд, чалавек спакваля.
    Як з лесу ён выйшаў, то ўзяўся тады
    Вырошчваць расліны сабе на палях,
    Дамы будаваць, а пасля гарады,
    Даіць малако ад каровы, казы,
    Сам вынайшаў кола, павозкі, вазы,
    Зямлю заваёўваць ён стаў спакваля.
Будуе ён многа разумных машын,
Кіруе ён імі, сядзіць ля руля
І родзіцца ў ім усё новы пачын,
Стварыў самалёты, а потым ракеты,
Яны далятаюць да іншай планеты,
Ён космас асвойвае ўжо спакваля.

**МОМАНТЫ**

Мы плывём у жыццёвых падзеях,
Сустракаем іх многа штодзень,
Частку памяць кладзе да музеяў,
Рэшта гіне ў бяздонні, як цень.
Лягуць моманты толькі ў архівы,
Памяць будзе іх браць праз жыццё,
Не забудзем выпадкаў жахлівых,
Рэдка пойдуць яны ў забыццё.
Часта помнім фрагменты, дэталі
Нават з многіх выпадкаў сваіх,
Бо ў свой дзённік мы іх не ўпісалі
І загіне аб іх хутка слых.
З дзён юнацтва, з тае атмасферы
Будзем помніць сяброўак, сяброў,
І ўсю нашу юнацкую веру,
Што жыццё прынясе нам дабро.
Будзем помніць з каханай сустрэчы,
Пацалункі, абдымкі, азарт,
У абдымках прыгожыя рэчы
І з усмешкамі позірк, і жарт.
У архіў ляжа многа фрагментаў
Тым, хто жыў у час грознай вайны,
І хто многа пазнаў кантынентаў,
Бачыў многа адценняў вясны.
Не запомніць ніхто вельмі многа
У падзеях, якія пражыў,
Злых калдобін жыццёвай дарогі
У раёнах сваіх і чужых.

**БЯЗМЕЖЖА**

На нашай бязмежнай прасторы зямлі
Стварылі ўсе людзі вакол сябе межы,
Паўсталі ў дзяржавах граніцы калісь,
Стаялі на іх назіральныя вежы.
Праз межы амаль што прайсці не маглі
Вялікія нават і бачныя зверы,
Іх воіны ўзброеныя сцераглі,
І межы былі, як жалезныя дзверы.
Адны толькі птушкі не маюць граніц,
Лятаюць свабодна па ўсіх кантынентах,
Не мае бязмежжа для іх таямніц,
Яны не шукаюць у ім інтэрвентаў.
Наведаюць нейкія гуртам у год,
Далёкую цёплую дзесьці краіну,
А потым вярнуцца да нас на расплод,
Каб восенню зноў нас з сям'ёю пакінуць.
Ляцяць у бязмежжа дзесь сотні ракет,
Блукаюць свабодна ў нябеснай прасторы,
Сігналы для нас прысылаюць з планет,
З іх здымкі, дзе бачым іх моры і горы.
Не маюць граніц сотні радыёхваль,
Ляцяць у бязмежжа залежна ад сілы,
Нясуць многа вестак і чуе іх даль,
Разносяць наўкол іх нябачныя крылы.
Культура народу не мае мяжы,
Расходзіцца хутка па цэлым бязмежжы,
Яе не затрымаюць снег і дажджы,
Граніцы і ўсе назіральныя вежы.

# ІМГНЕННІ З ПАДАРОЖЖА

## БАД РАЙХЕНГАЛЬ

Асенняй парою на дне катлавіны,
У Альпах скалістых глыбока ў шчыліне,
Спаткаў мяне казачны Бад Райхенгаль.
Дамы, як цукеркі, малюнкі на сценах
Глядзелі вачамі іх творцаў багемных,
І ззялі на сонцы, як светлы крышталь.
    Стаяла калісь тут царква паміж клумбаў,
    Згарэла яна ў час ваенны ад бомбы,
    Астаўся з яе толькі з купалам дах,
    Маркотна ляжаў ён на тратуары,
    Каб прыпамінаў там вайну і пажары,
    Якія няслі людзям горыч і жах.
Цяпер тут спакойна, бліскаюць вітрыны,
Таварам запоўнены ўсе магазіны,
Усіх запрашаюць, каб нешта купіць,
Касцёл нас святога Зянона вітае,
Другі цудатворнага зноў Мікалая
Званіцай высокай на неба глядзіць.
    На пляцах вадою чаруюць фантаны,
    А побач красуюцца ў клумбах цюльпаны
    І колерам радугі радуюць зрок,
    Наўкол сяляныя мы бачым купальні,
    І многа прыгожых вясёлых кавярняў
    Чаруе між вуліц, дзе ставім свой крок.
Канатнай дарогай ідуць ваганеткі,
Плывуць на гару, як чырвоныя кветкі,
І нас там вязуць у гатэль, рэстаран,
З іх відна ўвесь горад, дамы і касцёлы
І вузкія вуліцы, паркі наўкола,
І замак стары пазнаём Гутэнштайн.

**ЗАЛЬЦБУРГ**

Хаджу па вуліцах прыгожых,
Якія помняць крык рымлян.
Гляджу на позіркі прахожых,
На пляц, дзе ўгору б'е фантан.
            Калісь хадзіў тут Вольфганг Моцарт
            І дырыжор фон Караян.
            Вітрыныззяюць, быццам сонца,
            Блішчыць з рам медны калчадан.
Наўкол абацтвы і саборы,
То неаспрэчныя сляды,
Што каталіцтва тут апорай
Быў Зальцбург доўгія гады.
            Адсюль прагналі пратэстантаў.
            Архіепіскапы ўвесь час
            Трымалі ўладу, як гаранты,
            Што не парушыць іх каркас.
Назвалі горад Сольным Замкам,
Тут у гарах капалі соль.
Цяпер пах піва чуць ад ранку,
А з бараў чую алкаголь.
            Фунікулёр нас забірае
            У замак дзіўны на гару,
            Там Хоэнзальцбург нас вітае
            У вельмі цёплую пару.
Па вычварных ідзем пакоях,
Якія помняць сотні год,
Букеты кветак, сцен абоі
Напамінаюць агарод.

**БАБРУЙСК**

Лёс кінуў мяне ў шынялі, як салдата,
З варожай зямлі, дзе быў фронт, палігон,
Пад горад Бабруйск у вясковыя хаты,
У ціхі куток, у аўтабатальён.
Жыццё беларусаў я ўбачыў паблізу,
І пеша я ў горад хадзіў, калі мог,
Пазнаў яго вуліцы зверху і знізу,
Дзесяткі разбітых вайной сінагог.
Бо колькасць вайны ран была незлічона,
На вуліцы кожнай іх бачыў сляды,
На крэпасць, што помніла Напалеона,
З цікавасцю дзіўнай глядзеў я тады.
Хоць вочніцы ўсюды былі ў ёй пустыя,
Шурпатыя сцены ад бомбавых ран
Адважна глядзелі на дрэвы густыя.
Не страшны для іх быў ваенны ўраган.
Я частым быў госцем мясцовай бальніцы,
Дзе пільна лячылі мне рану з вайны.
З журбою глядзеў на пустыя званіцы,
Якія я бачыў з-пад Беразіны.
Старыя ўжо цэрквы я бачыў здалёку,
На купалах іх не было ўжо крыжоў,
Даўно камуністы знялі іх з наскоку,
Іх зрэзалі з купалаў, быццам нажом,
Бабруйск быў астатнім ваенным этапам
Блукання майго па чужыне зімой,
Адтуль удалося мне з лапаў сатрапа
Шчасліва ўцячы і дабрацца дамоў.

**ЗЕЕБУРГ**

Маленькі прускі гарадок,
Раней я ў ім не быў ніколі,
Затрымаў мой свабодны крок,
Як я ішоў дамоў з няволі.
Далі шынель тут, аўтамат,
На фронт паслалі акаянны,
Прывезлі зноў сюды назад,
Лячыць тут франтавыя раны.
Пасля пазнаў я ўвесь шпіталь,
Як працаваў тут санітарам,
Я пад салдатамі паркаль
Пабруджаны змяняў на нарах.
Пазнаў я вуліцы, дамы
Малы касцёл Варфаламея,
Пражыў два месяцы зімы
У час ваеннай эпапеі.
Аставіў многа я слядоў
На вузкіх вуліцах і скверах,
Якія вымыў дождж вадой,
Хачу іх кінуць на паперу.
Каб больш не чуць нямецкіх слоў,
Езёраны завецца горад,
А Зеебург пайшоў у схоў,
Аб назве той забылі скора.
Астанецца яна між тых,
Якія ў дні вайны, аблавы,
У ім былі ці нейкі слых
Да іх дайшоў у час крывавы.

**ПОЛАЦК**

З экскурсіяй ранкам прыехаў я ў Полацк,
Пабачыць гняздо беларускіх князёў,
У сонечным бляску ўсё ззяла наўкола,
Палата іскрылася між берагоў.
Ля вуліц стаялі пад’ёмныя краны,
Пры іх самасвалы скідалі пясок,
Залечвалі ў горадзе брудныя раны,
Кампрэсараў чханне было чуць здалёк.
Дрыжэў помнік шэры Фрацішка Скарыны,
На пляцу, трымаючы кнігу ў руках.
Калі тут радзіўся, такія машыны
Яго не пужалі, цяпер чуе страх.
Купцом не хацеў быць, астаўся вучоным,
Пасля беларускім ён быў друкаром,
Ён з Бібліяй выдаў кніг многія томы,
Тут толькі адзін нам паказвае том.
Па вузенькаў вуліцы крочым заўзята,
Якая праходзіць паблізу Дзвіны,
Мінаем там помнік савецкім салдатам,
Якія жыццё аддалі ў час вайны.
І Багаяўленскі сабор перад намі,
За камуністаў – спартыўны аб’ект,
Пасля галерэя карцін ў тоўстых рамах,
Цяпер на царкву замяніць ёсць праект.
Барочныя вокны ўжо чуюцца зручна,
Што зноў літургія тут будзе ўнутры,
Што песні гучаць будуць з кліраса гучна,
Што будуць маліцца штодзень святары.
А побач, дзе быў манастыр для манахаў,
Стварылі даўно старакніжны музей,
Там знойдзем дзесяткі старых альманахаў,
Апісана многа ў іх розных падзей.

Як тут пражывала клязёўна Рагнеда,
Дачка Рагвалода, з бацькамі сваймі,
Якія загінулі з помсты суседа,
Як жонкаю стала яго ў іх сям'і.
Яе сын тут княжыў, пасля дзеці ўнукаў,
Адзін сын яе сеў на кіеўскі трон,
І слава аб іх не загінула ў муках,
Дайшла ў арэоле да сённяшніх дзён.
Пасля мы ўвайшлі на вялікую плошчу,
І там Ефрасінні ўраз помнік знайшлі,
Высока трымае крыж Лазара Богшы,
Які быў адзіны на нашай зямлі.
Стаіць у прыгожым манаскім адзенні,
На горад стары скіравала свой зрок,
Глядзіць на Сафійскі сабор са здзіўленнем,
Які, як касцёл, выглядае здалёк.
Не помніць такога Сабора манашка,
Калі перапісвала сотні ў ім кніг,
Званіцы дзве там выглядаюць, як пляшкі,
Здаецца крыжамі праб'юць неба ўміг.
Сабор перажыў тут трагедый багата,
Не раз тут страшэнны адчуў ён удар,
Калі захапілі яго уніяты,
То двойчы яго нішчыў грозны пажар.
Пасля склад для пораху ў сценах сабора
Зрабіў рускі цар для салдатаў сваіх,
І выбух яго тут пачуў цэлы горад,
Разбурыў ён сцены, іконы святых.
І ў стылі барока сабор збудавалі,
Яго б не пазнаў Усяслаў Чарадзей.
Хаця ва ўніятаў яго адабралі,
З яго камуністы зрабілі музей.
Аднак Ефрасіння праз дрэвы густыя
Здалёк пазнае свой стары манастыр,
Царкву, дзе ляжаць яе мошчы святыя,
Дзе й слаўнаю стала, як наш багатыр.

Пражыў манастыр здзекі войнаў, тэроры,
Душыў тут яго не адзіны злы ўдаў,
Калі захапіў яго Стэфан Баторы*,
Тады ў кіпцюры езуітам аддаў.
Яны яго фрэскі ўсе фарбай закрылі,
Нідзе не было праваслаўных ікон,
Царкву ўсю ўнутры на касцёл замянілі,
І ўвесь манастыр узялі ў свой палон.
Пасля ад французаў атрымаў ён раны,
Бо тут недалёка грымелі баі.
Калі выгнаў цар езуітаў насланых,
Піяры аставілі шнараў раі.
І толькі тады, як ад іх адабралі,
Залечваць мог раны свае манастыр,
Паблізу царкву і сабор збудавалі,
Малітвы манашак ляцелі ў эфір.
Пасля Ефрасінні тут мошчы святыя
У Прэабражэнскую ўнеслі царкву,
І ў ёй працярпелі вайны ўсю стыхію,
Як гад рэвалюцыі мучыў Маскву.
Прыйшоў камунізм, манастыр быў закрыты,
І мошчы святыя ў натоўпе людзей
Забралі з царквы зверскі ў рацы адкрытай,
У Віцебск далі ў краязнаўчы музей.
Ляжалі ўвесь час там, пакуль акупанты
Пазволілі людзям вярнуць іх назад,
Прыйшлі камуністы – замоўклі куранты,
Малітвы людзей, праваслаўны абрад.
І толькі цяпер манастыр яркім бляскам
У келлях манашак чароўна заззяў,
І дух Ефрасінні з цудоўнаю ласкай
Усіх пад апеку сваю зноў забраў.

* Стэфан Баторы – польска-літоўскі кароль, які адабраў у 1579 г. Полацк ад маскоўскага князя Івана Жахлівага, які ў 1563 г. штурмам яго захапіў.



www.kamunikat.org

**1975 г. Францыя, Альбі. Злева: Таццяна Ершова, унучка контр-адмірала Анатолія Аляксеевіча Кананава і Дзмітрый Шатыловіч.**

# СЛЯДЫ ГІСТОРЫІ

## КРЫЖ

Крыж чалавецтву даўно быў вядомы,
Знaлі ў Егіпце яго, ў Вавілоне,
Сімвалам бога быў сонца ці грому,
Славіўся ён не ў адным пантэоне.
Быў ён вядомы ў пустынях іранскіх,
Першай быў літарай бога Тамуза,
Знaлі яго і ў культурах славянскіх:
Сонечны крыж іх упісвалі ў крузе.
Толькі рымляне, якіх легіёны
Ганьбілі сілай чужыя краіны
З крыжа стварылі слуп мукі шалёны,
Смерцю каралі на ім для руціны.
І на крыжы распіналі ў паходах
Сотні і тысячы ўзятых палонных,
Як не забілі для іх асалоды,
Пікай, мячом захапіўшы дзесь сонных.
Гучна распялі яны ў Іудзеі
Бога Ісуса Хрыста на Галгофе,
Можа быў гэта прадвеснік падзеі:
Згіне імперыя ўся ў катастрофе.
Ды катастрофа не знішчыла Рыму,
Цэзар змяніўся на рымскага папу,
Сімвалам сілы крыж стаў для рэжыму,
Зброяю новага ў Рыме сатрапа.
Армію моцную меў ён з крыжамі,
Замест любові смерць неслі і раны,
І з езуітамі, быццам з вужамі,
Бралі ў няволю людзей без пашаны.

**МАРК ШАГАЛ (1887-1985)**

Беларускі яўрэй і славуты мастак,
Ён праславіў свой Віцебск карцінамі ў свеце,
І талентам сваім, ён калісьці бядак,
Больш багатым зрабіў свет на нашай планеце.
У жыцці пераехаў амаль цэлы свет,
Бальшавіцкім калісь працаваў камісарам,
Не адзін у Нью-Йорку пазнаў кабінет,
А гуляў многа год па парыжскіх будьварах.
Маляваў ён карціны, рабіў вітражы
У вялікіх касцёлах, малых сінагогах,
Як яўрэй, не баяўся ўпрыгожваць крыжы,
Маляваць на плафонах Хрыста, ў небе Бога.
На карцінах яго ёсць купцы, скрыпачы,
Дзесь рамізнік лунае ў павозцы ў паветры,
Ёсць дзяўчына з вазонам у бляску свячы,
І анёлаў, як птушак пабачым на ветры.
Ёсць там рабін з чырвонай, як кроў, барадой,
Феерверкі на небе, бягучы сабака,
Ліхтары ў парку ззяюць над нейкай вадой,
Нават клюшні чырвоныя знойдзем у рака.
Знойдзем працы яго на эмалі, на шкле
Пра шчаслівых людзей і пра сумных, гаротных,
І пры сонечным бляску і ў шэрай імгле,
І пра Віцебск яго ўспамінаюць палотны.
Маляваў ён з фантазіяй, як футурыст,
І палотны яго ўзбагацілі музеі.
Не забудзе яго не адзін гуманіст,
Будуць славіць заўжды мастака-чарадзея.

**ДАВЫД ГАРАДЗЕНСКІ (каля 1283-1326)**

Быў князям у Пскове і праўнукам родным
Калісь пераможцы лівонцаў на льдзінах*,
Пасля кашталянам стаў слаўнай Гародні
І мужам чароўнай дачкі Гедыміна.
Даўно па загаду ксяндзоў з Ватыкана
Палкі крыжаносцаў з смяротнаю зброяй
Ішлі выпрабоўваць яе на славянах,
Каб іх мардаваць дзесь знянацку без бою.
Прынеслі раней смерць для многіх народаў:
Палабскім славянам, народ згінуў прускі,
Пасля учасцілі крыжакі паходы,
Каб знішчыць народы літоўскі і рускі.
Не раз крыжакі падышлі да Гародні
І замак яго ачапілі аблогай,
Заўсёды князь ноччу, а часам апоўдні,
Знянацку мячом насёк рыцараў многа.
Разбіў крыжакоў ён ля сцен Навагрудка,
Калі штурмавалі ўжо замак на ўзгорку
На лагер напаў князь, разбіў іх там хутка,
І выгнаў злых ворагаў без адгаворкі.
Адбіў ён не толькі ўсе злыя напады,
Наносіў ім часта ў рэваншах удары,
Уводзіў у Прусію смела атрады,
Забраўшы здабычу, рабіў ім пажары.
Калі князь праводзіў свой час у маршрутах,
Сям'ю захапіла крыжацкая зграя,
Каб з помсты забіць яго жонку Біруту
З малымі дзяцьмі ля Гародні на краі.
Тады князь для помсты сабраў многа войска.
Дайшоў з ім да Франкфурта і Магдэбурга,
Там згінуў ад польскага здрадніка Госта:
Убіў нож у плечы, як зняў князь кальчугу.

* Праўнук Аляксандра Неўскага па маці.



**1976 г. Крым. Дзмітрый Шатыловіч у Бахчысараі.**

# ЗМЕСТ

## ЖЫЦЦЁВЫЯ СЦЕЖКІ

Жыццё, як лодка ў акіяне ---------------------------------- 5
Забавы ------------------------------------------------------------ 6
Змярканне ------------------------------------------------------- 7
Зіма ---------------------------------------------------------------- 8
Дарогі ------------------------------------------------------------ 9
„Балота” ------------------------------------------------------ 10
Сівы кастрычнік ------------------------------------------- 11
Калі адыходзяць сябры ---------------------------------- 12
Масты ---------------------------------------------------------- 13
Колеры змяркання --------------------------------------- 14
Старое пакаленне ------------------------------------------ 15
Бацькоўскі дом -------------------------------------------- 16
Першая прагулка вясной -------------------------------- 17
Сакрэтны супрацоўнік ---------------------------------- 18
Цыганскі табар --------------------------------------------- 19
Сакавік пасля снежнай зімы --------------------------- 20
Нядзеля -------------------------------------------------------- 21
Чароўны сад ------------------------------------------------ 22
Адуванчыкі -------------------------------------------------- 23
„Жамчужына захаду” ----------------------------------- 24
Мелодыі дзяцінства ------------------------------------- 25
Усходняя сцяна -------------------------------------------- 26
Жалейка ------------------------------------------------------ 27
Начная вясёлка --------------------------------------------- 28
Смутак -------------------------------------------------------- 29
Нязведаны сум ---------------------------------------------- 30
Чаканне ------------------------------------------------------- 31
Я падарожнік ----------------------------------------------- 32
Вясковыя печы --------------------------------------------- 33
Ноччу ў шпіталі -------------------------------------------- 34
Цябе я шукаў ----------------------------------------------- 35
Расставанне ------------------------------------------------- 36
На чужыне -------------------------------------------------- 37
Успомніце жыццёвую дарогу -------------------------- 38

Хачу я да цябе ляцець ---------------------------------- 39
Жыццё плыло, як судна --------------------------------- 40
Белавежская ідылія --------------------------------------- 41
Жахлівы чэрвень ------------------------------------------ 42
Лужыны ---------------------------------------------------- 43
На рэчцы -------------------------------------------------- 44
Не ведаю, ці заўтра ўбачу ------------------------------ 45
Абсяг ------------------------------------------------------ 46
Народная песня ------------------------------------------- 47
Шукаю ----------------------------------------------------- 48
Вобмацкам ------------------------------------------------ 49
Спадчына ------------------------------------------------- 50
Хачу ўсю ноч на пашы быць вясёлым --------------- 51
Узлёт і падзенне ----------------------------------------- 52

## ШЭДЭЎРЫ ПРЫРОДЫ

Ахова прыроды ------------------------------------------ 53
Лясныя пахі ---------------------------------------------- 54
Кланіраванне --------------------------------------------- 55
Прэсна ---------------------------------------------------- 56
Павук ----------------------------------------------------- 57
Вербы над ракою ---------------------------------------- 58
Падыйшла да нас вясна -------------------------------- 59
Драчы ----------------------------------------------------- 60
Валошкі -------------------------------------------------- 61
Бакланы -------------------------------------------------- 62
Пчала ----------------------------------------------------- 63
Жураўлі -------------------------------------------------- 64
Кіньце гарадскія сцены -------------------------------- 65
Зямля ----------------------------------------------------- 66

## АНАМАЛІІ ЖЫЦЦЯ

Людзі сталі, як бярвёны -------------------------------- 67
Ці сорамна вам, барацьбіты? ------------------------- 68
Каго вінаваціць ------------------------------------------ 69

Марыянеткі ---------------------------------------------- 70
Без сораму ------------------------------------------------ 71
Манія ўлады ---------------------------------------------- 72
Нянавісць ------------------------------------------------- 73
Семяноўскае водасховішча --------------------------- 74
Нам нельга жыць з закрытымі вачыма -------------- 75
Незалежнасць і свабода ------------------------------- 76
Аптымізм ------------------------------------------------- 77
Хворы на хваробу Альцгеймера --------------------- 78

**ЛЮДСКІЯ СЛЯДЫ**

Людскія крокі --------------------------------------------- 79
Чацвёртае вымярэнне ----------------------------------- 80
Грамніцы ------------------------------------------------- 81
Спакваля ------------------------------------------------- 82
Моманты -------------------------------------------------- 83
Бязмежжа ------------------------------------------------ 84

**ІМГНЕННІ З ПАДАРОЖЖА**

Бад Райхенгаль ------------------------------------------ 85
Зальцбург ------------------------------------------------ 86
Бабруйск ------------------------------------------------- 87
Зеебург -------------------------------------------------- 88
Полацк --------------------------------------------------- 89

**СЛЯДЫ ГІСТОРЫІ**

Крыж ----------------------------------------------------- 93
Марк Шагал (1787-1985) -------------------------------- 94
Давыд Гарадзенскі (каля 1283-1326) ----------------- 95

БІБЛІЯТЭКА
Беларускага літаратурнага аб'яднання
„БЕЛАВЕЖА"

Серыя заснаваная ў 1990 г.

Кніжка семдзесят пятая

Рэдактар
*(Наталля Асіпавіч)*

© Copyright by Dymitr Szatyłowicz, 2010

ISBN 978-83-7657-069-3

Mariusz Śliwowski
Białystok, ul. Zwycięstwa 26c lok. 7
tel. (085) 869 14 87, 0602 766 304
e-mail: prymat@biasoft.net, www.prymat.biasoft.net

www.kamunikat.org